

**Працадаўцы ў апошні час актыўна выкарыстоўваюць інтэрнэт. І не толькі для размяшчэння ў ім вакансій, але і для атрымання дадатковай інфармацыі аб кандыдатах на працоўнае месца.** СТАР. 2



**Мадэрнізацыя — гэта пастаянны працэс. Навука ідзе наперад. Мы ведаем, што свет будзе ўступаць у 6-ты тэхналагічны ўклад. І калі мы хочам прабіцца ў сусветную эканоміку, нам неабходны адпаведныя вытворчасці.** СТАР. 4



**Па падборы экспанатаў музей у вёсцы Старое Сяло Віцебскага раёна, прысвечаны самаму высокаму чалавеку на зямлі Фёдару Махнову, лічыцца адным з вядучых не толькі ў раёне. Быццам, можна ганарыцца. Але...** СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. ЧАЦВЕР № 192 (27307) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Актуальна

Сяргей МАСКЕВІЧ:

## «НАСТАЎНІК ПАВІНЕН БЫЦЬ АРТЫСТАМ...»

**МІНІСТР адукацыі Сяргей Маскевіч падтрымлівае ідэю стварэння пры сваім ведамстве грамадскага савета, у які маглі б увайсці прадстаўнікі як педагагічнай, так і бацькоўскай грамадскасці. Аб гэтым ён паведаміў, адказваючы на пытанне журналіста «Звязды» на прэс-канферэнцыі, што прайшла напярэдадні Дня настаўніка ў Нацыянальным прэс-цэнтры:**

— Прызнаюся, што я і сёння выкарыстоўваю розныя крыніцы інфармацыі пры прыняцці тых ці іншых рашэнняў — выязджаю ў школы, сустракаюся з бацькамі школьнікаў. Я цудоўна разумею людзей, якія доўгі час займаліся распрацоўкай Кодэкса аб адукацыі: яны ўсё прымалі блізка да сэрца, прапусцілі ўсё праз сябе, таму сёння яны адстойваюць сваю пазіцыю і лічаць, што тое, што мы маем, — гэта аптымальна. Але ёсць і іншыя людзі, настроеныя больш ліберальна, больш крытычна, якія лічаць, што многія пазіцыі, адлюстраваныя ў Кодэксе, патрабуюць пераацэнкі і пераасэнсавання. Я вельмі спадзяюся, што нарэшце запрацуе Беларускае педагагічнае таварыства, дзейнасць якога ў гэтым годзе была адноўлена. Я вельмі задаволены дзейнасцю клуба «Хрустальны журавель», які аб'ядноўвае ўдзельнікаў і пераможцаў конкурсу «Настаўнік года». Таму я ўжо ўяўляю сабе, хто б мог увайсці ў дарадчы орган. Магчыма, мы арганізуем пры міністэрстве пастаянную дыскусійную пляцоўку, у тым ліку і віртуальную, каб была магчымасць хутка даведвацца пра меркаванне грамадскасці па актуальных для ўсёй галіны пытаннях.

Галоўны вектар развіцця сістэмы адукацыі, па словах Сяргея Маскевіча, — гэта паляпшэнне якасці адукацыі, а асноўная задача ведамства на бліжэйшы час — ажыццяўленне глыбокага аналізу адукацыйных праграм і вучэбнай нагрузкі. «Як паказвае сусветная практыка, узровень ведаў школьнікаў больш якасна ацэньваецца незалежнымі экспертамі, а не школьнымі настаўнікамі. Таму Міністэрства адукацыі разглядае зараз магчымасць увядзення незалежнага нацыянальнага экзамену ў базавай школе», — дадаў кіраўнік ведамства.

Не выключаецца ў галоўным адукацыйным ведамстве таксама і магчымасць увядзення на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі прафілізацыі навучання.

**«Вышэйшы пілатаж» у педагогіцы павінен заахвочвацца матэрыяльна. Але ці гатова наша педагагічная грамадскасць да таго, што хтосьці з калег будзе атрымліваць звышзаробкі?**

— Для нас вельмі важна павысіць якасць прафарыентацыйнай работы, — падкрэсліў міністр. — Пытанне рэгулявання патокаў выпускнікоў вельмі сур'ёзнае. Ні для каго не сакрэт, што зараз на старэйшую ступень школы можа трапіць любы ахвотны. Між іншым, старэйшая ступень фактычна з'яўляецца прыступкай для паступлення ў ВНУ. І там проста так бавіць час за партай ужо нельга: будучы студэнт павінен быць нацэлены на навучанне, а таксама на тое, што ў ВНУ яму прыйдзецца па-сапраўднаму «пахаць» для атрымання новых ведаў...

Сёння падрыхтоўка педагагічных кадраў вядзецца ў 14 ВНУ. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі працуюць больш як 107 тысяч педагагічных работнікаў. З 1 верасня да працы прыступілі 6 300 маладых спецыялістаў — выпускнікоў устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Закранаючы пытанне дэфіцыту кадраў у галіне, міністр падкрэсліў, што ў краіне пераважна не адчуваецца дэфіцыту педагагічных кадраў. Пры гэтым у некаторых школах прыцягваюцца да работы па асобных прадметах педагогі, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, а таксама лепшыя студэнты 5 курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. СТАР. 2

**ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу 18 кастрычніка 2012 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 18 кастрычніка 2012 года з 9.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

# ФУТБОЛ ЯК ЦУД!

**Не, гэта не салодкі сон. Гэта сапраўды тая рэчаіснасць, якую можна памацаць рукамі, убачыць на газетных палосах, экранах тэлевізараў, а не ў ружовым тумане ўласных мар. Наш БАТЭ ў Мінску перамог нямецкую «Баварыю» — сусветнага гранда, аднаго з фаварытаў сёлетняга розыгрышу Лігі чэмпіёнаў.**

Па заканчэнні гульні стадыён-пенсіянер «Дынама» перажываў другую маладосць. Арэна літаральна патанала ў татальнай эйфарыі. Распранутыя фанаты шалелі, журналісты задаволена ўсміхаліся, а футбалісты святкавалі цудоўную вікторыю ў цэнтры поля. Вось ён, еўрапейскі фурор. Беларускія клубы яшчэ ніколі не перамагалі ў еўракубках каманды калібру «Баварыі»! А тым больш у хатнім інтэр'еры, пры родных балельшчыках, з пераканаўчым лікам 3:1. Натуральна, адзінкі верылі ў падобны вынік. Але многія ведалі дакладна: хлопцы Віктара Ганчарэнкі бой славутаму саперніку дадуць. СТАР. 3



Фота БЕЛТА.

БАТЭ ў Мінску перамог нямецкую «Баварыю» — сусветнага гранда, аднаго з фаварытаў сёлетняга розыгрышу Лігі чэмпіёнаў.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінгарвыканкама:**

*«Каля 8,8 тысячы мінчан з пачатку года зняты з чаргі маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У горадзе праводзіцца работа па зверцы спісу чаргавікоў, і да красавіка будучага года, згодна з даручэннем Прэзідэнта, яе плануецца завяршыць. Па звестках на верасень, у чарзе маючых патрэбу знаходзяцца каля 269 тыс. чалавек».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 18° |
| Віцебск | + 16° |
| Гомель | + 17° |
| Гродна | + 17° |
| Магілёў | + 15° |
| Мінск | + 16° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.10.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8570,00 | ▲ |
| Еўра | 11050,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 274,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1051,66 | ▲ |

## «НАКІРУЕМ МАШЫНУ, ЯБЛЫКІ ЗАБЯРОМ»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**ЛІТАРАЛЬНА ў мінулым нумары газеты мы ў падборцы матэрыялаў распавялі пра сёлетні багаты ўраджай яблыкаў, згадалі і пра некаторыя праблемы, якія з'явіліся дзякуючы такой міласці прыроды. Наш чытач з пасёлка Міханавічы Мінскага раёна, напэўна, не паспеў азнаёміцца са свежым нумарам «Звязды», паколькі патэлефанаваў у рэдакцыю з самага ранку. У процілеглым выпадку, магчыма, пытанняў у заяўніка было б менш, але як гаспадара яго можна ў любым выпадку зразумець: яблыкаў жа ўсё роўна шкада.**

— Абяцалі яшчэ ў канцы мінулага тыдня забраць ападкі. Я гэтую антонаўку літаральна на каленях два дні збіраў. Набраў у мяхі паўтоны. Стаяць зараз яны і гніюць, бо мне ўвесь час называюць іншую дату, калі прыедуць па яблыкі.

Ды і па цане нейкі непарадак: напачатку абяцалі па 300 рублёў за кілаграм, цяпер кажуць, што плаціць будуць з разліку 150 рублёў за кілаграм, — эмацыйна распавёў нам інвалід другой групы Рыгор Міхайлавіч Мішчарка.

Вядома ж, мы нагадалі чытачу і пра рэкордны ўраджай, і пра падзенне кошту яблыкаў у гэтай сувязі, і пра патрэбы перапрацоўчых прадпрыемстваў, якія, на жаль, не бясконцыя...

Але агульная інфармацыя такой і застанецца, калі табе трэба вырашыць канкрэтную праблему. Таму рэдакцыя звярнулася ў Мінскае раённае спажывецкае таварыства, пагутарыла з шэрагам спецыялістаў па нарыхтоўцы.

У чарговы раз пацвердзілася, што сёлета яблыкаў — багата. Напрыклад, ад названага спажывецкага таварыства штодня працуе шэсць машын, на перапрацоўчыя прадпрыемствы адвозяць па 30 тон пладоў. Між тым, дадалі спецыялісты «па сакрэце», зараз у Мінскай вобласці без праблем можна здаць яблыкі толькі на Барысаўскі кансервавы завод. У іншых абласцях, куды рэкамендавана здаваць на перапрацоўку сёлетні ўраджай (на прадпрыемствы ў Глыбокім, Пінску, Баранавічах), яго вядуць па... запісе. Настолькі вялікія аб'ёмы сёлета.

Калі гаварыць пра сітуацыю з чытачом, дык да яго ў прызначаны дзень папросту... не даехалі. Усё па той жа, як запэўнілі нас, прычыне: машына ўжо была загружана. А потым нарыхтоўшчык, да якога звярталіся жыхары пасёлка з набалелай праблемай, запісаў, што яблыкі забяруць праз некалькі дзён.

Але рэдакцыі паабяцалі ўзяць пытанне на асаблівы кантроль, падкрэслілі, што машына да жыхара з вуліцы Школьнай (і не толькі да яго аднаго) абавязкова дойдзе. Пра цану таксама нічога новага сказана не было. Папершае, яна аб'ектыўна зніжаецца. Па-другое, каб не плаціць падаходны падатак, трэба прадаставіць даведку з сельскага Савета, што ўраджай вырашчаны на ўласным участку. Але некаторым вяскоўцам няма часу для таго, каб узяць патрэбную паперку.

А ад сумы закупкі давядзецца заплаціць 12 працэнтаў падаходнага падатку, калі не будзе вышэйназванай даведкі. Магчыма, нарыхтоўшчык сваімі словамі спрабаваў давесці гэтую інфармацыю, але не ўсе яго зразумелі. Адсюль і ўзнікла пэўная блытаніна з лічбамі. На момант нашага звароту нам сказалі, што закупачная цана на яблыкі — 200 рублёў за кілаграм пры наяўнасці даведкі з сельскага Савета.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Адабраныя прэтэндэнты на Прэмію ўрада краіны за дасягненні ў галіне якасці 2012 года

**ПЯЦЬДЗЯСЯТ беларускіх прадпрыемстваў з розных галін эканомікі трапілі ў спіс прэдэндэнтаў на званне лаўрэата і будуць змагацца за перамогу ў конкурсе, каб атрымаць Прэмію ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці 2012 года.**

Як адзначаюць арганізатары, найбольшая канкурэнцыя сёлета чакаецца па такіх напрамках дзейнасці, як вытворчасць харчовых тавараў і сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння. Сярод удзельнікаў такія вядомыя ў Беларусі і за межамі нашай краіны прадпрыемствы і брэнды, як Беларускі металургічны завод, «Гомсельмаш», «Амкадор», «Марка», «БЕЛІТА», «Элема», «Камунарка», «Спартак», «Санта Брэмар» і інш.

Большая частка прэтэндэнтаў удзельнічае ў конкурсе не першы раз — ім трэба будзе пацвердзіць званне лаўрэата, атрыманае раней. І толькі чвэрць прэтэндэнтаў будзе ўдзельнічаць у конкурсе ўпершыню. Распачаты другі этап конкурсу, калі пасля вывучэння экспертамі пададзеных дакументаў праводзіцца наведванне прадпрыемстваў-прэтэндэнтаў, каб на месцы ацаніць стан працы ў галіне якасці.

Чакаецца, што пераможцы стануць вядомыя ў канцы года — лаўрэаты атрымаюць дыпломы, сімвалы прэміі і, што найбольш важна, правы выкарыстання ў маркіроўцы прадукцыі, дакументацыі і ў рэкламных матэрыялах выявы эмблемы прэміі.

**Іван СТУЖКА.**

## АЙЧЫННАЯ ШКОЛА СЁННЯ




## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### УДЗЕЛЬНІКІ МІТЫНГУ Ў КЫРГЫЗСТАНЕ СПРАБАВАЛІ ПРАРВАЦЦА Ў ДОМ УРАДА



У цэнтры сталіцы Кыргызстана Бішкеку некалькі сотняў удзельнікаў мітынгу пратэсту спрабавалі сілай прарвацца ў будынак Дома ўрада, дзе размешчаны нацыянальны парламент і апарат прэзідэнта краіны, паведамляюць інфармагенцтвы. Каля 500 чалавек прыбыло ў цэнтр Бішкека на мітынг, патрабуючы нацыяналізаваць найбуйнейшае ў краіне сумеснае з канадскім бокам золатаздабыўное прадпрыемства «Кумтор». Калону ўдзельнікаў акцыі ўзначальвалі лідары парламенцкай апазіцыі ад партыі «Айчына». Некаторыя з мітынгоўцаў зламалі агароджу Дома ўрада і сілай спрабавалі пранікнуць у будынак. Аднак спроба захопу была спынена супрацоўнікамі праваахоўных органаў. Міліцыя адціснула мітынгоўцаў з дапамогай святлогукавых гранат і слёзатачывага газу. Затрымана некалькі ўдзельнікаў мітынгу. Тры чалавекі былі шпіталізаваны з агнястрэльнымі раненнямі.

### БЕЛЬГІЯ ЗАСТАЛАСЯ НА СУТКІ БЕЗ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ

Бельгійскія чыгуначнікі праводзяць сутачную забастоўку, якая паралізавала транспартныя зносіны ўнутры краіны, паведамляе Associated Press. У выніку было адменена мноства цягнікоў, якія ідуць праз Бельгію транзітам, у тым ліку высакахуткасныя цягнікі з Вялікабрытаніі ў Францыю і назад. Работнікі бельгійскай чыгункі арганізавалі забастоўку ў знак пратэсту супраць планаў кампаній-аператараў аптымізаваць правілы працы. На думку страйкоўцаў, гэта паставіць пад пагрозу іх занятасць і прывядзе да масавых звальненняў.

### ЦЫГАРЭТЫ І АЛКАГОЛЬ ПРАВАКУЮЦЬ РАК ПАДСТРАЎНІКАВАЙ ЗАЛОЗЫ

Людзі, якія актыўна злоўжываюць спіртным і цыгарэтамі, могуць у больш раннім узросце ў параўнанні з астатнімі сутыкнуцца з ракам падстраўнікавай залозы, сведчыць даследаванне Універсітэта Мічыгана. Такім чынам, у заядлых курцоў, норма якіх — больш за пачак у дзень, рак, як правіла, знаходзілі ў 62 гады, а ў п'яніц (тых, хто выпіваў больш за 39 грамаў алкаголю ў дзень) — у 61 год. Між тым, звычайна яго дыягнастуюць у 72 гады, піша Zee News. Само па сабе курэнне з'яўляецца значным фактарам рызыкі, а алкаголь правакуе акісляльны стрэс у печані, што актывуе запаленчыя рэакцыі, якія могуць прывесці да раку. Гэта даказвае абследаванне 811 ракавых хворых.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### РАСІЙСКАЯ НАФТА МОЖА СКОНЧЫЦЦА ПРАЗ 22 ГАДЫ?

Такое меркаванне, прынамсі, выказаў на XXVI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Хімічныя рэактывы, рэагенты і працэсы маластанажнай хіміі» супрацоўнік Уфімскага



дзяржаўнага нафтавага хімічнага ўніверсітэта Фархад Вільданаў. Тым самым эксперт пацвердзіў песімістычны прагноз, зроблены раней Нямецкім інстытутам эканомікі. «Я лічу, мы не можам спадзявацца толькі на аптымістычныя прагнозы расійскіх экспертаў, лічачы, што нам хопіць нафты на 150 гадоў. Нам неабходна пераходзіць на новыя крыніцы сыравіны, — падкрэсліў навуковец... Няхай прадукт будзе даражэй, але ён будзе, таму што нафта можа скончыцца ў любы момант».

КОРАТКА

У Мінску ўчастак праспекта Дзяржынскага да медуніверсітэта плануецца адкрыць да 7 лістапада. Цяпер рух па праспекце Дзяржынскага арганізаваны да вуліцы Уманскай. У наступным годзе чакаецца завяршэнне ўсіх работ на гэтым праспекце.

Восенню да 80% ДТЗ адбываецца ў цёмны час сутак або ў дрэннае надвор'е, паведаміла старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Беларусі Ганна Банадык. ДАІ адзначае, што ў змярканні або пры ападках аўтамабілі, асабліва цёмнага колеру, уяўляюць вялікую небяспеку, бо яны дрэнна бачныя. Таму вадзіцелям рэкамендуецца ўключаць блізкае святло, не чакаючы поўнай цемры.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт плануе ў 2013 годзе адкрыць 12 новых спецыяльнасцяў і 5 новых напрамкаў спецыяльнасцяў. БДУ плануе ўнесці ў агульнадзяржаўны класіфікатар Беларусі і адкрыць у наступным годзе такія спецыяльнасці, як «ядзерныя фізіка і тэхналогіі», «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі», «камп'ютарная фізіка», «фізічная і медыцынская электроніка», «космаэракартаграфія» і іншыя.

Сабекошт праезду ў грамадскім транспарце Мінска перавышае 5 тысяч рублёў. Каля 65% выдаткаў на арганізацыю транспартнага абслугоўвання насельніцтва кампенсуецца з бюджэту.

# «НАСТАЎНІК ПАВІНЕН БЫЦЬ АРТЫСТАМ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Я лічу, што, калі ў школе ёсць як вопытныя кадры, так і моладзь, — гэта цудоўна, таму што павінна быць пераемнасць пакаленняў. Сталыя настаўнікі павінны перадаваць свой досвед маладым. Таму, калі ў педагогаў, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, будзе жаданне і магчымасць працаваць у школе, мы будзем гэта толькі вітаць . Але, як паказваюць даследаванні, абсалютная большасць педагогаў, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, не жадае працягваць педагагічную работу. Для настаўнікаў надзвычай актуальна прафесійнае выгаранне. А настаўнік, я ўпэўнены, павінен гарэць. Ён павінен быць артыстам і якасна выконваць на ўроку сваю ролю... Толькі ў гэтым выпадку можна разлічваць на поспех.

Як вядома, са студзеня 2013 года ў Беларусі стартуе пілотны праект па новым механізме фінансавання ўстаноў адукацыі, зыходзячы з нарматыву на аднаго вучня. Міністр адукацыі лічыць, што сістэму аплаты працы педагогаў трэба змяняць і прывязваць яе да канкрэтных вынікаў іх работы.

**Старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА** паведаміў журналістам, што сярэдні заробак у сферы адукацыі сёння складае 332 долары, а напрыканцы 2010 года ён складаў 427 долараў.

— На жаль, нягледзячы на тое, што тарыфная стаўка першага разраду некалькі раз пераглядалася, нам пакуль не ўдалося выйсці на ўзровень 2010 года. Пагадзіцеся, што пры выбары настаўніка для свайго дзіцяці бацькі кіруюцца або грамадскай думкай (цікавяцца меркаваннем суседзяў, сваякоў, сяброў), або ўласным досведам. Таму ўсе масава ідуць да аднаго настаўніка і праходзяць міма іншых. Я абсалютна ўпэўнены, што вышэйшы пілатаж у педагогіцы павінен заахвочвацца матэрыяльна. Але ці гатова наша педагагічная грамадскасць да таго, што хтосьці з калег будзе атрымліваць звышзаробкі? Асабіста я ў гэтым не ўпэўнены... Сёння вядзецца работа над праектам аб атэстацыі педагагічных работнікаў. Пазіцыя прафсаюза заключаецца ў тым, каб розніца ў аплаце за наяўнасць першай, другой і вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ў педагогаў была істотнай. Каб ва ўсіх педагогаў быў стымул да павышэння сваёй кваліфікацыі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# РЫНКУ ПРАЦЫ ПАТРЭБНЫ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

**ЯК людзі зараз шукаюць работу? Што прапаноўваюць наймальнікі? На якія хітрасці ідуць пры вывучэнні кандыдатаў на пасаду? Якія новыя формы работы прапаноўваюць? Беларускі рынак працы спрабуе адаптавацца да патрэб часу, ён становіцца больш гнуткім і мабільным.**

## ПРА ЗАРОБАК І НЕ ТОЛЬКІ

Якія зарплаты прапануюць нам сёння? У Мінску ёсць вакансія юрыста з заробкам у 2 млн рублёў (у Разлікова-даведачным цэнтры), і ў той жа час грузчыкам крамы гатовы плаціць ад 4 мільёнаў. Медсястры абяцаюць ад 1 мільёна беларускіх рублёў у дзяржарганізацыі і да 520 долараў у прыватным медыцынскім цэнтры. Атэль «Мінск» шукае прыбіральшчыка на зарплату ў 3,4 млн рублёў, затое сярэдняя школа № 202 згодна плаціць за аналагічную працу толькі 1,2 мільёна. Пінскае ААТ «Тавары для жанчын» мае патрэбу ў прадаўцы. Праўда, заробак абяцаюць усяго 1,2 млн, затое ў г. Бяроза прадавец можа атрымаць 2,8 млн рублёў. Вадзіцелю розныя арганізацыі гатовы плаціць і 1.245.000 рублёў, і 4,5 мільёна... Рынак працы поўны падобных перакосаў, а мы ўжо амаль перасталі ім здзіўляцца. Хоць часта ўзровень зарплаты спецыяліста вельмі залежыць ад яго кваліфікацыі. Адыгрывае ролю і запатрабаванасць прафесіі, і яшчэ мноства фактараў у кожным канкрэтным выпадку.

На рынку працы па-ранейшаму назіраецца дысбаланс попыту і прапановы. Работадаўцы шукаюць менеджараў па продажах, кіроўцаў, прарабаў, зваршчыкаў, мантажнікаў, тынкоўшчыкаў, кладаўшчыкоў, заатэхнікаў, грузчыкаў. Так, па словах кадравікоў, найбольшы попыт сёлета ў першым паўгоддзі назіраўся на спецыялістаў будаўнічых спецыяльнасцяў, айцішнікаў, бухгалтараў, медыкаў, адміністрацыйны персанал. Таксама запатрабаваны на рынку працы спецыялісты, якія маюць не толькі вузкаспецыялізаваныя веды, але і больш пашыраныя: напрыклад, веданне замежных моў, міжнародных стандартаў. У Мінску вельмі запатрабаваны рабочыя спецыяльнасці. Затое сярод тых, хто шукае працу, у лішку эканамісты, спецыялісты па кадрах, настаўнікі, юрысты, перакладчыкі...

Спецыялісты адзначаюць, што сёння многія не схільныя да змены месца працы з-за страху страціць стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Аднак апытанне, якое было праведзена ў рамках праекта RABOTA.TUT.BY, паказала: з 84% чалавек, якія прынялі ўдзел у ім, 64% заявілі, што зараз працуюць, аднак знаходзяцца ў пасіўным пошуку працы і перыядычна праглядаюць новыя вакансіі, прычым 27% робяць гэта штодня.

**У эканоміцы нашай краіны ў студзені — чэрвені 2012 года было задзейнічана 4574,1 тыс. чалавек.**

Фактараў змяніць работу можа быць шмат. Асноўная прычына — гэта нізкая заработная плата (пра гэта заявілі 44% апытаных). Цікава, што ўсяго 4% апытаных задавальняе іх месца працы і яны не збіраюцца яе мяняць у бліжэйшы час. Яшчэ 8% хоць і не задаволены месцам, дзе працуюць, але не шукаюць альтэрнатывы.

## ІНТЭРНЭТ У ДАПАМОГУ

Сёння ўсё больш і больш людзей шукаюць працу з дапамогай інтэрнэту. Так, усё тое ж апытанне, праведзенае ў рамках праекта RABOTA.TUT.BY, паказала, што задзейнічаюць інтэрнэт у пошуках працы 62% апытаных. З вялікім адрывам другое месца займае пошук працы праз сувязі і знаёмствы (27% апытаных).

У сваю чаргу, працадаўцы ў апошні час таксама актыўна выкарыстоўваюць інтэрнэт. І не толькі для размяшчэння ў ім вакансій, але і для атрымання дадатковай інфармацыі аб кандыдатах на працоўнае месца. У прыватнасці, для гэтага яны праглядаюць звесткі з сацыяльных сетак. Прычым менеджары па падборы персаналу такім чынам ацэньваюць не прафесійныя якасці, а асабістыя. «Вывучыўшы профіль, можна зразумець, напрыклад, ці падыдзе па карпаратыўнай культуры чалавек пэўнай кампаніі», — сцвярджае **дырэктар IT-кампаніі Вольга ПЯТРОВА.** Наколькі гэта этычна і ці не могуць патэнцыйныя кандыдаты палічыць выкарыстанне інфармацыі з сацыяльных сетак умяшаннем у прыватнае жыццё, абмяркоўвалі эксперты **«круглага стала» «Цяжкасці і тэндэнцыі сучаснага стымулявання працы ў Рэспубліцы Беларусь».** І сышліся ў меркаванні, што HR-спецыялісты маюць права выкарыстоўваць звесткі, якія размешчаны ў інтэрнэце ў адкрытым доступе.

## ПРАЦА НА ДАМУ

Нашы працадаўцы становяцца больш гнуткімі. Некаторыя ўжо не патрабуюць ад сваіх супрацоўнікаў знаходжання 8 гадзін у офісе, а гатовы плаціць за выкананую працу, прычым не важна, дзе і калі менавіта вы яе выканалі. У некаторых фірмах практыкуецца аддаленая праца, надомная праца, калі бухгалтары, менеджары па закупках і іншыя працуюць дома, прыязджаючы ў офіс толькі час ад часу. Гэта выгадна і наймальнікам — адпадае патрэба ў арэндзе вялікага офіса, уладкаванні працоўных месцаў, і работнікам — дазваляе спалучаць працу з сямейнымі абавязкамі (напрыклад, з доглядам дзяцей ці састарэлых), спрыяе атрыманню дадатковага даходу і г.д.).

Як было сказана на праведзеным у Мінску **экспертна-медыйным семінары «Нетыповыя формы занятасці, якія прымяняюцца на агульным рынку працы Саюзнай дзяржавы»,** камп'ютарызацыя, інфарматызацыя, аўтаматызацыя, укараненне новых гнуткіх вытворчых сістэм прывялі да істотных змен у сферы арганізацыі працы. Усё гэта спрыяе з'яўленню нестандартных формаў занятасці: працы па-за асноўным офісам (асабліва гэта распаўсюджана сярод праграмістаў), няпоўнага працоўнага часу (частковай занятасці), гнуткага працоўнага графіка, сумаванага ўліку працоўнага часу і г.д.

**У студзені—чэрвені 2012 года прыём работнікаў кампенсаваў іх выбыццё на 87,9%. За гэты перыяд было прынята на работу 377,4 тыс. чалавек, што на 52 тыс. менш, чым звольнена (429,5 тыс. чалавек).**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як лічаць аналітыкі ў галіне рынку працы, у развітых краінах такімі формамі занятасці ахоплена ў сярэднім ад 15% да 30%, а то і 40% работнікаў. Сёння такая тэндэнцыя знаходзіць сваё развіццё і ў Беларусі.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, у 2012 годзе было праведзена даследаванне ў мэтах вывучэння маштабаў распаўсюджвання гнуткіх формаў занятасці і афармлення наймальнікамі пры гэтым працоўных адносін з работнікамі.

У двух апытаннях прынялі ўдзел больш за 340 суб'ектаў гаспадарання: буйныя і сярэднія арганізацыі, малыя і мікраарганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія займаюцца самымі рознымі відамі дзейнасці. Аналіз адказаў удзельнікаў апытання паказаў, што 82% з іх у 2011 годзе выкарыстоўвалі нетыповыя формы занятасці работнікаў. У цэлым, ва ўсіх гэтых суб'ектах гаспадарання падобнымі формамі работы было ахоплена каля 30% наёмных работнікаў.

Афармляліся адносіны з супрацоўнікамі па-рознаму. Амаль 88% суб'ектаў гаспадарання паказалі, што заключаліся працоўныя дагаворы, 28% — выкарыстоўвалі грамадзянска-прававы дагавор. Пры гэтым больш за 97% усіх апытаных суб'ектаў гаспадарання паказалі на адсутнасць праблем пры афармленні працоўных адносін з работнікамі пры ўжыванні нетыповых формаў занятасці. У тым ліку 90% рэспандэнтаў паведамілі, што патрабаванні дзеючага заканадаўства, якімі рэгулююцца працоўныя адносіны наймальніка з работнікамі, не з'яўляюцца перашкодай для развіцця іх бізнэсу.

Зрэшты, ёсць і фактары, якія стрымліваюць выкарыстанне нетыповых формаў занятасці. У іх ліку кампаніі называюць вялікі аб'ём працы для кадравых службаў, недахоп інфармацыі аб работніках, якія жадаюць працаваць у гнуткіх умовах занятасці, а таксама пэўны недавер з боку работнікаў да такой занятасці.

**Святлана БУСЬКО.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## У МІНСКУ ЦЯПЕР БУДУЮЦЬ 14 ГАСЦІНІЦ

Цяпер у горадзе ўзводзяцца 14 гасцініц, і яшчэ 18 аналагічных аб'ектаў знаходзяцца на стадыі праектавання. Пра гэта паведамілі ў камітэце эканомікі Мінгарвыканкама.

Узвядзенне гасцінічных комплексаў стала адным з кірункаў інвестыцыйнай дзейнасці ў сталіцы. Намаганні горада накіраваны на развіццё інфраструктуры ў рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года.

— Сёння ў горадзе Мінску дзейнічаюць 27 атэляў, 2 аналагічныя аб'екты знаходзяцца на рэканструкцыі, — адзначылі ў камітэце. — К 2014 году ў сталіцы маюць намер пабудаваць 32 гасцініцы і стварыць, такім чынам, больш за 7 тыс. новых гасцінічных месцаў.

Сёлета, у прыватнасці, будзе завершана рэканструкцыя «Прэзідэнт-атэля», у верасні ўведзены ў эксплуатацыю атэль «Гарні». Плануецца, што ў першы год працы гэтыя аб'екты прынясуць значныя валютныя паступленні.

У камітэце таксама падкрэслілі, што, ствараючы шырокую гасцінічную інфраструктуру, ужо сёння неабходна рыхтаваць аснову для яе запаўнення, развіваючы сферу ўязнога турызму і эфектыўна пазіцыянуючы гэты від паслуг на міжнародным рынку.

Усе пабудаваныя гасцінічныя аб'екты, бізнэс-цэнтры, забаўляльныя комплексы будуць запатрабаваныя і стануць прыносіць прыбытак і пасля правядзення чэмпіянату, лічаць у камітэце.

*«Мінск-Навіны».*

## ШЧАСЛІВАЯ «ХУТКАЯ»

У Магілёве ўначы 2 кастрычніка аўтамабіль «Фальксваген Гольф» сутыкнуўся з двума аўто і загарэўся.

За рулём «Фальксвагена» быў 30-гадовы жыхар Магілёва. Паводле паведамлення ДАІ, ён выбраў небяспечную хуткасць, не звярнуў увагі на мокры асфальт, у выніку чаго адбылося сутыкненне з двума аўтамабілямі, прыпаркаванымі на краі дарогі. Аднак на гэтым справа не скончылася: «Фальксваген», у якога абарваўся бензаправод, загарэўся. І толькі шчаслівы выпадак выратаваў вадзіцеля.

— Менавіта тады ў гэтым месцы праязджаў аўтамабіль хуткай дапамогі, — расказала інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Таццяна Старасотнікава. — Медыцынская брыгада выцягнула мужчыну з аўтамабіля: апёкаў ён не атрымаў, але быў траўміраваны ў выніку аварыі. Паводле папярэдняй інфармацыі, вадзіцель быў нецвярозы.

**Ілона ІВАНОВА.**

## НА ЗАПРАЎКАХ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ КОШТ ПАЛІВА

**Канцэрн «Белнафтахім» зацвердзіў з 3 кастрычніка новыя адпускныя і розрічныя цэны на нафтапрадукты. Рознічныя цэны на бензін і дызельнае паліва, якія рэалізуюцца праз АЗС, павялічыліся ў сярэднім на 5 працэнтаў.**

Як паведамілі ў прэс-службе канцэрна, цяпер на аўтазаправачных станцыях рознічныя цэны на нафтапрадукты наступныя: бензін Нармаль-80 — 6 750 рублёў за адзін літр, бензін АІ-92 — 6 950 рублёў, бензін АІ-95 — 7 500 рублёў, дызельнае паліва — 7 650 рублёў, дызельнае паліва Еўра-5 — 8 050 рублёў за адзін літр. Перагляд цэн на нафтапрадукты, як патлумачылі ў канцэрне, праведзены ў сувязі з ростам цаны на нафтавую сыравіну (на 19 працэнтаў у параўнанні з узроўнем чэрвеня гэтага года, калі адбылася папярэдняя карэкціроўка цэн на нафтапрадукты), а таксама «ў мэтах паэтапнага збліжэння цэн на тавары ў краінах Мытнага саюза і павышэння эфектыўнасці працы беларускіх нафтаперапрацоўчых заводаў для забеспячэння магчымасці далейшай мадэрнізацыі вытворчасці».

## ВЫРАСЛІ ЦЭНЫ НА МЯСА

**З 4 кастрычніка ў краіне павялічваюцца гранічныя максімальныя адпускныя цэны на свініну і ялавічыну ў тушах. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Міністэрства эканомікі №78 ад 1 кастрычніка. Апошняе ўступае ў сілу з вышэйназванай даты.**

Пастановай міністэрства павялічаны гранічныя максімальныя адпускныя цэны: на свініну ў тушах — да ўзроўню дзейнай зараз адпускной цаны на буйнакавалкавы мяса-косны паўфабрыкат са свініны, на ялавічыну ў тушах — на 30 працэнтаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АБЗАЦ

◢ Верасень 2012 года быў самым цёплым за апошнія 7 гадоў. Па звестках метэаролагаў, тэмпература паветра па краіне склала 13,5 градуса, што на 1,6 градуса вышэй за кліматычную норму.

◢ **Прыватны інвестар плануе рэалізаваць праект па будаўніцтве дзвюх ветраўстановак у Смаргонскім раёне. Таварыства з абмежаванай адказнасцю «АэроСтрим» мае намер укласці больш за Br3 млрд у будаўніцтва двух ветракоў на пляцоўках, вызначаных пад закладку ветрапарку. Пляцоўкі знаходзяцца паблізу ад Крэва і Папялевічаў. Завяршыць будаўніцтва мяркуецца да канца наступнага года.**

◢ Па звестках пракуратуры, на будпляцоўках Мінска ў студзені—чэрвені гэтага года было зарэгістравана 96 выпадкаў вытворчага траўматызму з цяжкім зыходам, 14 — са смяротным.

◢ **Ноччу 3 кастрычніка ў Керчы (Крым) аўто з беларускімі нумарамі сарвалася з абрыву, адзін чалавек загінуў. Аўтамабіль Nissan Patrol рухаўся на высокай хуткасці з боку дачнага пасёлка, у напрамку да цэнтра горада. На кароткім неасветленым участку дарогі кіроўца разагнаў аўтамабіль. Перад паваротам направа ён паспрабаваў затармазіць, аднак хуткасць машыны была вялікая. Аўтамабіль вылецеў на левую ўзбочыну дарогі, перакуліўся і, праляцеўшы больш за 20 метраў, сарваўся ўніз з абрыву. Ад удару 47-гадовы кіроўца, грамадзянін Беларусі, загінуў на месцы. Яго пасажыр быў дастаўлены з траўмамі ў гарадскую бальніцу Керчы. Паводле папярэдніх звестак, у яго пералом нагі.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ У Вялікабрытаніі двум сябрам, якія рэгулярна наведвалі адзін і той жа рэстаран з фуршэтным прынцыпам работы, назаўсёды адмовілі ў абслугоўванні. Па назіраннях кіраўнікоў кропкі грамадскага харчавання, парачка пастаянна з'ядала ўсё, не пакідаючы нічога астатнім наведвальнікам. Рэстаран прапануе сваім кліентам самастойна сабраць для сябе страву з інгрэдыентаў, якія ёсць у наяўнасці (сырое мяса і гародніна ляжаць у вялікіх талерках, і кожны можа «сканструяваць» пачастунак на свой густ). Пасля кухар абсмажвае тое, што выбрана. Пры гэтым колькасць падыходаў не абмежавана — трэба толькі заплаціць 12 фунтаў. Як расказвае абслуговы персанал, сябры змяталі ўсё, што падавалася, пры гэтым ніколі не замаўлялі напоі і не плацілі за дадатковыя паслугі. Нядаўна дырэктар рэстарана падышоў да іх і папрасіў ніколі больш не прыходзіць. «Мы, у рэшце рэшт, не дабрачынная арганізацыя, а кампанія, якая хоча зарабіць», — сказаў ён.




## Извещение об открытом аукционе по продаже объектов недвижимости в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) с учетом НДС | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Комплекс зданий и сооружений (капитальные строения с инв. №№ 400/С-49630, 400/С-49634, 400/С-41847) | г. Гродно ул. Буденного, 28 | 2 556 495 480 | 255 000 000 | Продажа в собственность | Склад (площадь 214,8 кв.м), склад с подвалом, компрессорная, навес (площадь 543,8 кв.м), два склада навес (площадь 475,0 кв.м) асфальтобетонное покрытие, бетонное покрытие, ворота, калитка, электрическая сеть, тепловая сеть. Площадь земельного участка – 0,3138 га, кадастровый номер 440100000002005061. |

Лот продается по договору поручения. Здания частично обременены договорами аренды. Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

3) Победитель аукциона обязан в течение 7-ми рабочих дней с момента подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи.

4) Оплата за объект производится: 50% в день заключения договора купли-продажи, оставшиеся 50% в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.

**Аукцион состоится 5 ноября 2012 года в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. № 61, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 4 октября по 30 октября 2012 г.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта**: www.grodno.gov.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды изолированных помещений и зданий в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь (кв.м) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта и условия использования |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды здания на 5 лет | г. Гродно, ул. Репина, 45 | 727,7 | 34 973 640 | 3 500 000 | Аукцион без условий | Одноэтажное кирпичное с подвалом. |
| 2. | Право аренды изолированных помещений на 5 лет | г. Гродно, ул. Щорса, 39 | 426,1 | 20 384 460 | 2 000 000 | Исключить использование помещений под магазин продовольственных товаров | Помещения на 1-ом этаже 3-этажного здания. |

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости». Лоты продаются по договору поручения.

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

3) Платеж за право заключения договора аренды осуществляется по безналичному расчету в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

4) Победитель аукциона в течение 5-ти рабочих дней с момента подписания протокола аукциона обязан заключить договор аренды.

5) С проектом договора аренды и ставками арендной платы можно ознакомится в ОАО «Плодоовощсервис» по адресу: г. Гродно, ул. Победы, 31.

**Аукцион состоится 5 ноября 2012 года в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. № 61, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 4 октября по 30 октября 2012 г.** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже объектов недвижимости в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) без учета НДС | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Комплекс зданий и сооружений (капитальные строения с инв. №№ 400/С-36937, 400/С-36938, 400/С-36939, 400/С-36940, 400/С-36941, 400/С-36942, 400/С-36944, 400/С-36945) | г. Гродно, Скидельское шоссе, 4а | 4 739 472 000 | 470 000 000 | Продажа в собственность | Мастерская, площадью 493,7 м.кв., материально-технический склад, площадью 767,5 м.кв., растворо-бетонный узел, площадью 59,3 м.кв., бытовое помещение, площадью 651,6 м.кв., трансформаторная подстанция, площадью 47,5 м.кв., склад цемента площадью 109,8 м.кв., заправочная станция, площадью, 22,4 кв.м, компрессорная станция площадью 47,9 м.кв., забор железобетонный, протяженностью 323,0 м.п., забор металлический, протяженностью 135,0 м.п., ворота с калиткой, площадью 14,3 м.кв., мачта осветительная – 2 шт., площадь земельного участка 4,1325 га, кадастровый номер 440100000002004646. |

Лот продается по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Гродненском горисполкоме. Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**Аукцион состоится 5 ноября 2012 года в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. №61, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 4 октября по 30 октября 2012 г.** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Извещение о проведении 05 ноября 2012 года торгов по продаже имущества ОАО «Белметалл»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе): Порядковый номер предмета торгов, наименование и площадь продаваемого имущества (сведения об обременениях) | Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе): Инвентарный номер по ЕГРНИ | Начальная цена без НДС, руб. | Сумма задатка, руб. | Место нахождения предмета торгов (аукциона) |
|---|---|---|---|---|
| 1. Административное помещение № 16, площадь 16 кв. м (аренда) | 500/D-70792015 | 149 955 000 | 14 995 500 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 16 |
| 2. Административное помещение № 17, площадь 16,1 кв. м (аренда) | 500/D-70792016 | 140 822 000 | 14 082 200 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 17 |
| 3. Административное помещение № 18, площадь 32,2 кв. м (аренда) | 500/D-70792017 | 281 644 000 | 28 164 400 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 18 |
| 4. Административное помещение № 19, площадь 32,9 кв. м (аренда) | 500/D-70792018 | 287 766 000 | 28 776 600 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 19 |
| 5. Административное помещение № 20, площадь 16,9 кв. м (аренда) | 500/D-70792019 | 147 819 000 | 14 781 900 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 20 |
| 6. Административное помещение № 24, площадь 9 кв. м (аренда) | 500/D-70792023 | 55 734 000 | 5 573 400 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 24 |
| 7. Административное помещение № 32, площадь 33,7 кв. м (аренда) | 500/D-70792031 | 294 764 000 | 29 476 400 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 32 |
| 8. Административное помещение № 33, площадь 33 кв. м (аренда) | 500/D-70792032 | 288 641 000 | 28 864 100 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 33 |
| 9. Административное помещение № 34, площадь 16,7 кв. м (аренда) | 500/D-70792033 | 146 070 000 | 14 607 000 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 34 |
| 10. Административное помещение № 35, площадь 24 кв. м (аренда) | 500/D-70792034 | 190 600 000 | 19 060 000 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 35 |
| 11. Административное помещение № 36, площадь 41,5 кв. м (аренда) | 500/D-70792035 | 362 988 000 | 36 298 800 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 36 |
| 12. Административное помещение № 37, площадь 16,9 кв. м (аренда) | 500/D-70792036 | 147 819 000 | 14 781 900 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 37 |
| 13. Административное помещение № 38, площадь 67,7 кв. м (аренда) | 500/D-70792037 | 622 215 000 | 62 221 500 | г. Минск, ул. Казинца, д. 2, пом. 38 |

Продавец имущества – ОАО «Белметалл», пр. Партизанский, 174, 220075, г. Минск.

Организатор торгов – **УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского Кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Белметалл», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки), заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение за организацию и проведение аукциона уплачивается победителем торгов (покупателем) помимо оплаты стоимости приобретенного имущества.

Торги состоятся **05 ноября 2012 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 05.10.2012 по 01.11.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 327-48-36 – (УП «Минский городской центр недвижимости»);**

**(017) 344-54-51 (ОАО «Белметалл»).**

■ Ну і ну!

## РАСПІСАЛІСЯ Ў... БАЛЬНІЧНАЙ ПАЛАЦЕ

**Зарэгістраваць шлюб Наталля Мікіцевіч і Анатоль Пруські планавалі ў Тумілавіцкім сельскім Савеце Докшыцкага раёна. Але нявеста — нечаканы зігзаг лёсу — трапіла ў Полацкую бальніцу. Урачы рабілі ўсё магчымае, каб своечасова вылечыць Наталлю і выпісаць яе напярэдадні вяселля. Але ж, на жаль, ім гэта зрабіць не ўдалося: дзяўчыне катэгарычна забаранілі пакідаць бальніцу.**

Тады кіраўнік справамі Тумілавіцкага сельвыканкама Валянціна Наско прапанавала: калі ўжо Наталля не можа прыехаць у вёску, трэба ехаць да яе, каб непасрэдна ў бальніцы правесці цырымонію. Кіраўніцтва бальніцы сітуацыю зразумела і не адмовіла ў рэгістрацыю шлюбу ў медыцынскай установе.

Медыкам і хворым, якія сталі выпадковымі сведкамі незвычайнай падзеі, гэтае вяселле запомніцца на ўсё жыццё. Да бальніцы, як мае быць, прыехаў вясельны картэж. Ад жаніха запатрабавалі прызнанняў у каханні... Нявесту рыхтавалі да цырымоніі ў палаце: вясельны строй, прычоска — усё было!

Ардынатарская ператварылася ў абрадавую залу. Там па старажытнай беларускай традыцыі закаханыя сталі на святочнае палатно, абмяняліся заручальнымі пярсцёнкамі, станцавалі самы першы ў жыцці ў якасці новаспечаных мужа і жонкі вальс. Не абышлося і без сімвалічнага напою — шампанскага, але, вядома, у дазволенай медыкамі колькасці.

Новай беларускай сям'і пашанцавала на добрых людзей, якія працуюць у медыцынскай установе і сельвыканкаме. Дарэчы, і для выканкама менавіта гэтая рэгістрацыя шлюбу стала першай выязной.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Акцыя

## «ЛЁС ЛЕСУ — У НАШЫХ РУКАХ»

**Пад такім дэвізам ва ўсіх рэгіёнах краіны 13 лістапада па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі пройдзе агульнарэспубліканская акцыя «Чысты лес». Яе асноўная мэта — прыцягнуць увагу грамадскасці да неабходнасці беражліва ставіцца да лесу і не засмечваць яго.**

Тое, што гэтая праблема, на жаль, застаецца вострай, пацвярджаюць лічбы. За 8 месяцаў у лясным фондзе сабрана амаль 8 тысяч кубічных метраў бытавога смецця. Большая яго частка — каля 3 тысяч кубаметраў — знаходзілася ўздоўж аўтамабільных дарог. Амаль 2 тысячы кубаметраў смецця сабрана ў месцах адпачынку і на прылеглых да іх тэрыторыях. Яшчэ 3 тысячы кубаметраў рознага бытавога смецця сабралі вакол населеных пунктаў і дачных пасёлкаў.

Узяць удзел у акцыі можа любы ахвотны. Трэба толькі звярнуцца ў любое лясніцтва і заявіць пра сваё жаданне паўдзельнічаць у ёй. Арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі забяспечаць усіх добраахвотнікаў неабходным рыштункам, арганізуюць вываз смецця. Увогуле, нагадаем, акцыя праводзіцца ўжо чацвёрты год і паспела сабраць пастаянных удзельнікаў. Штогод у ёй бяруць удзел больш за 10 тысяч чалавек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Здарэнні

## НЕ ЗАЎВАЖЫЎ ДРЭВА

**У Віцебску каля 23.00 на вуліцы Люднікава загарэўся грузавы аўтамабіль «МАЗ» з паўпрычэпам. Потым высветлілася, што за рулём яго знаходзіўся мужчына ў стане моцнага алкагольнага ап'янення. Праехаўшы метраў дзесяць, машына «ўпёрлася» ў дрэва. Вадзіцель, не разумеючы, чаму яна не едзе далей, стаў газаваць. Так працягвалася некалькі хвілін, пакуль ад моцнага трэння не загарэлася гума шын.**

Міліцыянеры, якія праязджалі міма, убачылі, што ў аўтамабіля гараць колы. Паспрабавалі патушыць полымя, але агонь хутка распаўсюдзіўся па аўтамабілі.

У выніку пажару былі знішчаны маторны адсек, агнём пашкоджаны кабіна, пярэдняя частка паўпрычэпа і груз на паўпрычэпе — будаўнічы ўцяпляльнік (10 куб. м). Аўтамабіль належыць аднаму з наваполацкіх прыватных прадпрыемстваў. Лёс гора-кіроўцы вырашыць следства. Аб гэтым паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## «ДЖЭДАЙ» ПАДВЁЎ НА ВАДАСХОВІШЧЫ

**На гадзінніку было 3.32 ночы, калі выратавальнікам стала вядома: каля пасёлка Ратамка ў акваторыі Заслаўскага вадасховішча знаходзяцца людзі, якія не могуць самастойна дабрацца да берага — не заводзіцца рухавік яхты.**

— Калі нашы спецыялісты прыбылі на месца выкліку, на адлегласці 10 метраў ад берага сапраўды знаходзілася яхта «Джэдай», якая належыць таварыству з абмежаванай адказнасцю «Тытунь-Інвест» (філіял «Робінсан-клуб»). У ёй былі чатыры чалавекі: два хлопцы і дзве дзяўчыны, — паведамілі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — Выратавальнікі на маторнай лодцы «Брык-450» даставілі на бераг дзяўчат, якія былі нападпітку. Стан іх быў здавальняючы, у шпіталізацыі яны патрэбы не мелі. Маладзёны ад дапамогі адмовіліся.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПРАД'ЯВІЦЕ ВАШ СПІРТ!

**Колькі спірту можна схаваць у салоне мікрааўтобуса, ды так, што з першага погляду аўтамабіль выглядае пустым? Шмат, да 4 тысяч літраў. Праўда, трэніравацца трэба доўга, сістэматычна. Менавіта гэтае, апошняе, слова, хутчэй за ўсё, будзе рэфрэнам гучаць у крымінальнай справе, якая пагражае жыхару Баранавіч.**

*Повестка дня Общего Собрания акционеров:* 1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Технобанк» путем выпуска дополнительных простых (обыкновенных) акций, размещаемых путем проведения открытой подписки, и утверждении проспекта эмиссии акций.

*Орган Банка или иные лица, созывающие Общее Собрание акционеров, основание его созыва:* акционер ОАО «Технобанк» Курач И.А., обладающий не менее чем десятью процентами голосов от общего количества голосов акционеров банка, основание созыва – собственная инициатива, требование указанного акционера в соответствии с частью четвертой статьи 49 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах».

*Порядок ознакомления лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании, с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению этого собрания, с указанием адреса, по которому можно с ней ознакомиться*: предоставление для ознакомления информации (документов), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, осуществляется в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, на основании письменного запроса (на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк») лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании акционеров и(или) их уполномоченных представителей.

*Порядок регистрации лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании:* регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании: с 13.30 до 14.00 по месту проведения собрания при предъявлении документов, подтверждающих их личность (паспорт) и полномочия представителей акционеров (документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; доверенность).

*Иные сведения, предусмотренные уставом хозяйственного общества и (или) решением о проведении общего собрания участников хозяйственного общества:* ОАО «Технобанк» выдана лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности №11 от 31.05.2010; УНП ОАО «Технобанк» – 100706562.

**ООО «ЮРГА-Инвест» совместно с администрацией Центрального района г. Минска**

## ПРОВОДИТ ОБЩЕСТВЕННОЕ ОБСУЖДЕНИЕ

**по объекту «Административного здания с торговыми помещениями и кафетерием»**

в р-не ул. Крапоткина–В. Хоружей–Гая в г. Минске, с 08.10.12 г. по 23.10.12 г. в здании администрации Центрального района, находящегося по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 6.

УНП 191684245

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 23 октября 2012 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Помещение на 1-м этаже капитального строения, клуб связи (инв. № 110/С-92733), по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская, д. 81 | 162 000 | 16 200 | 12,00 | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств) |
| **ЛОТ № 2** | Площади на 1 этаже, в т.ч. помещения и часть помещения, вспомогательные площади, капитального строения (инв. № 100/С-40877), по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Луцкая, д. 46 | 1 171 800 | 117 180 | 86,8* в т.ч. 77,1 (12,8; 12,6; 24,2; 27,5) 9,7 (2,5; 7,2) | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств) |
| **ЛОТ № 3** | Помещение на 3-м этаже капитального строения, здания районного узла почтовой связи (инв. № 123/С-23617), по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Интернациональная, д. 30 | 311 580 | 31 158 | 23,10 | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств) |
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды** | | | | | |
| **Наименование арендодателя** | **РУП «Белпочта»** | | | | | |
| **Срок договора аренды** | **5 лет** | | | | | |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений. 2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка. 3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. | | | | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108, руб. РБ в рег. дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509 | | | | | |

**Аукцион состоится 23 октября 2012 г. в 11.00 (лот № 1), в 11.15 (лот № 2), в 11.30 (лот № 3) по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: *г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329* в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 22 октября 2012 г. до 17.00. Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

■ Фестывалі

# ЛАДДЗЯ «ТЭАРТА»: РОСПАЧ, РАДАСЦЬ І ІНШЫЯ ПАЧУЦЦІ

## БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНЫМ ТЭАТРАЛЬНЫМ ФОРУМЕ БУДЗЕ ПРАДСТАЎЛЕНА СПЕКТАКЛЕМ ПАВОДЛЕ КАРАТКЕВІЧА

**Гэты праект падрыхтаваны «Цэнтрам візуальных і выканальніцкіх мастацтваў», які створаны ў краіне і падтрыманы Міністэрствам культуры. Па сутнасці, «Ладдзя роспачы» стане першым сведчаннем стварэння альтэрнатыўнай тэатральнай студыі, каб сцвердзіць: сучаснае тэатральнае мастацтва — вельмі адкрытае, гнуткае, можа існаваць не толькі ў рамках рэпертуарнага тэатра, яно можа ствараццa дзеля ідэі, вакол якой аб'яднаўся калектыў аднадумцаў...**

**Дырэктар «Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў» Анжэліка КРАШАЎСКАЯ** патлумачыла:

— У нас быў інтарэс да беларускай драматургіі, як мне здаецца, незаслужана забытага аўтара. Нас падтрымала Міністэрства культуры, не было сумненняў, ставіць ці не. Пастаноўка будзе на беларускай мове. Ідэя спектакля належыць Вользе Мацкевіч і Ігару Пятрову. Яны працуюць як рэжысёры. Яны маладыя і, можа быць, імёны іх невядомыя публіцы. Таму натуральна, што можа ўзнікнуць пэўная боязь аддаць твор маладому малавядомаму рэжысёру. Але мы не шукаем лёгкіх шляхоў, мы імкнёмся сумесна ісці сваім шляхам, стварыць пастаноўку, у якой занята вялікая колькасць акцёраў, у тым ліку вядомыя купалаўцы Аляксандр Падабед, Мікалай Кірычэнка. Удзельнічае шмат маладых акцёраў. Для мяне ў гэтым выпадку катэгарычна непрымальнае слова «антрэпрыза» ў дачыненні да гэтага праекта. Таму што як альтэрнатыва рэпертуарнаму тэатру могуць з'яўляцца тэатральныя студыі. Так пачыналі шмат якія пляцоўкі ў Расіі, якія ўжо набылі вядомасць. Але ў рамках міжнароднага фестывалю мы не робім акцэнт на беларускай праграме, таму што ёсць Нацыянальная тэатральная прэмія. Мы зрабілі акцэнт на той працы, якую мы як цэнтр лічым для сябе важнай: праграма разлічана на міжнародны фармат.

Сёлета ў Мінску ёсць асобная праграма расійскіх спектакляў, намінантаў прэміі «Залатая маска». Пачаўся форум з пастаноўкі «Шэрбургскіх парасонаў» Санкт-Пецярбургскага музычнага тэатра «Карамболь», якую ацаніў сам аўтар Мішэль Легран — ён быў на прэм'еры. Прыезду гэтай пастаноўкі ў Беларусь папярэднічалі вельмі доўгія і складаныя перамовы: ёсць спецыфіка паказу спектакля. Але ўдалося вырашыць усе праблемы, якія, здавалася, узнікаюць нейкім фатальным чынам: нават прыйшлося замяняць ужо выбраную пляцоўку, каб паказ у Мінску ўсётакі адбыўся. З пазнакай «Залатая маска ў Беларусі» будуць паказаны яшчэ дзве маскоўскія пастаноўкі: «Запалі мой агонь» (Театр.doc ) і «Нічыя доўжыцца імгненне» (Расійскага акадэмічнага моладзевага тэатра).

У рамках міжнароднай праграмы сёлета два спектаклі з Вільнюскага тэатра Оскараса Каршуноваса: «Міранда» і «На дне». Латвійскі нацыянальны тэатр пакажа сваю версію «Мёртвых душ», Рускі тэатр Эстоніі прывозіць спектакль, прысвечаны Таркоўскаму пад назвай «Адна летняя ноч у Швецыі». Павінна зацікавіць і «Персона. Мэрылін» Драматычнага тэатра імя Г. Хлоўбка з Польшчы. І прыцягвае ўвагу італьянская пастаноўка з правакацыйнай назвай: «Аб канцэпцыі аблічча Сына Божага». Аматары пластычных спектакляў адзначаць дзве польскія пастаноўкі: «Мінус 2» і «Пустэча». Упершыню ў рамках беларускага «Тэарта» вылучана асобна моладзевая праграма: магчымасць паглядзець спектаклі малодых рэжысёраў і акцёраў.

— У нас у рэспубліцы сёння існуе 8 тэатральных фестываляў як рэспубліканскага, так і міжнароднага значэння, — адзначыў **Міхаіл КАЗЛОВІЧ, начальнік упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры**. — Гэта сведчыць, што Міністэрства культуры зацікаўлена, каб з'яўляліся новыя праекты ў галіне тэатральнага мастацтва і разнастаілі культурную панараму рэспублікі. Праект «Тэарт» дае магчымасць шырокай публіцы і спецыялістам у галіне тэатральнага мастацтва пазнаёміцца з дасягненнямі сусветнай культуры. Для нас вельмі важна, што ў рамках гэтага праекта рэалізуецца праграма майстар-класаў, у якіх удзельнічаюць вядомыя прадстаўнікі сусветнага тэатральнага мастацтва, сустрэчы адбываюцца ў Акадэміі мастацтваў, у харэаграфічным каледжы. Таму што прафесійны ўзровень нашых кадраў — у прыярытэце дзяржаўнай палітыкі.

Такі фестываль, як «Тэарт» праводзіцца ў Беларусі толькі другі год. Але насамрэч яго гісторыя пачалася нашмат раней — з «тэатральнага тыдня з Белгазпрамбанкам, які ўтварыўся, таму што ў людзей ёсць патрэба не толькі ў ежы, колькі ў ежы духоўнай. Як адзначыў **дарадчык старшыні праўлення банка Уладзімір САЖЫН**: «Гэта была калыска «Тэарта», але нельга ўвесь час жыць у калысцы». І вось цяпер мы маем вялікі форум, які пачаўся 2 кастрычніка, а скончыцца 20-га. Цэлых тры тыдні можна жыць эмоцыямі, якія дорыць тэатр.

**Андрэй САВІНЫХ, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў** адзначыў:

— Культура — інструмент фарміравання станоўчага знешняга іміджу краіны, найбольш прыдатная глеба, на якой можна заявіць пра сябе. Таму што іншыя нацыі, людзі з іншым менталітэтам будуць цікавіцца Беларуссю ў сілу адрознення. У сілу таго, што тут ёсць самабытныя, невядомыя ім раней з'явы. І на гэтым можна сфарміраваць устойлівую пастаянную цікавасць да нашай краіны. Я думаю, што гэты фестываль адметны тым, што тут дэманструюцца мастацкія тэндэнцыі, якія будуць цікавыя не толькі беларусам, але і нашым суседзям, можа быць і краінам далёкага замежжа... Я думаю, што мы не заўсёды ўспрымаем магчымасці і дасягненні, якія ў нас ёсць, таму што для нас яны звыклыя. Нам часам не хапае погляду збоку, каб зразумець, наколькі цікава развіваецца ў нас сітуацыя ў той ці іншай сферы мастацтва ці грамадскага жыцця, эканомікі. Погляд назіральніка здалёк трошкі іншы. Мне здаецца, што «Тэарт» можа стаць цікавым кірункам у фарміраванні станоўчага іміджу перш за ўсё таму, што тэатр — мастацтва сінтэтычнае, якое прымяняе і вобраз, і гук, і рух, і нараджае адпаведныя эмоцыі.

**Ларыса ЦІМОШЫК**



Беларускі мастак Зіновій Марголін адзначаны «Залатой маскай» за сцэнаграфію да гэтага спектакля.

Фота БЕЛТА.

■ Чалавек сярод людзей

# «Даўгалецце — гэта ў спадчыну»

**...Як на свой узрост, дык Любоў Львоўна Калядка яшчэ вельмі маладжавая і бадзёрая. Усміхаецца: «Хіба ж я думала, што дажыву да гэткіх гадоў?!»**

Так склалася, што ў сям'і яна была адна. Бацька паехаў на заробкі ў Амерыку ды так і не вярнуўся, пісаў лісты, прысылаў фотакарткі, там і памёр. А дзяўчынка скончыла ўсяго два класы мясцовай школы. Мела здольнасці да матэматыкі. Але ж, каб неяк выжыць, трэба было дапамагаць маці па гаспадарцы, працаваць...

Якраз праца, калектывізацыя, да якой аднавяскоўцы ставіліся вельмі насцярожліва, зрабілі ёй ці не найбольшы падарунак. Агітатарам за калгасы быў Герасім — прыгожы сур'ёзны юнак з суседняй вёскі.

Пабраліся яны ў 1931-м. Ён брыгадзірам працаваў, пчаляром... Дзеці нарадзіліся. Жыць бы ды жыць! Калі б не вайна. Гаспадар быў ваеннаабавязаным, ішоў на фронт і не ведаў, што назаўсёды развітваецца з любімай жонкай і чацвёркай малых.

А Любоў Львоўна ўсе гады ліхалецця пражыла ў роднай вёсцы — у голадзе і холадзе, у цяжкай працы і з адною думкай: «Толькі б зберагчы дзяцей». Невыносна цяжка было! Але ж Бог дапамог — выстаялі, дачакалася такой жаданай перамогі! Вось толькі радасць ад яе была азмрочана страшнаю весткай: светлым майскім днём 1945-га ў дом Калядкаў прынеслі пахавальную на мужа, што загінуў пад Кёнігсбергам.

Не ведае Любоў Львоўна, як перажыла гэту страту:

— Жыццё раптам страціла сэнс, — успамінае яна. — І каб не дзеці, не праца...

Арала, касіла, даглядала жывёлу, нарыхтоўвала ў лесе дровы — ніякай работы не цуралася! Толькі б падняць малых... Як цяжка ні было — адной.

Зрэшты, у гады маладосці ды і потым да яе, працавітай, акуратнай, заўсёды ветлівай з людзьмі, сваталіся неблагія мужчыны. І можна было б паспрабаваць уладкаваць сваё сямейнае жыццё. Але яна не парушыла клятву, якую дала сама сабе: зберагла вернасць свайму Герасіму Іванавічу, свайму першаму каханню.

Ці шкадуе аб гэтым? Кажа, што не. Ганарыцца тым, што дзеці шанавалі і шануюць яе, ва ўсім дапамагаюць. Сын Анатоль быў ваенным, на вялізазны жаль, памёр. А дочкі Валя, Галя і Людміла жывуць на Случчыне. У Любові Львоўны сем унукаў, 12 праўнукаў і 4 прапраўнукі.

— Я, дзякуй Богу, яшчэ трымаюся, — кажа яна. — Але ж без дапамогі дзяцей, людзей была б нічога б не вартая. Як-ніяк 101(!) гадок за спіной... Зрэшты ў нас, дзякаваць Богу, усе доўга жылі. Мама — 93, бабуля — 105. Даўгалецце — гэта мо ў спадчыну?

І нягледзячы ні на што?

**Галіна МАКАРЭВІЧ,**

*г. Слуцк.*

# ГУЛІВЕРА ВЕДАЕМ, А СВАЙГО ВЕЛІКАНА НЕ ШАНУЕМ?

**У вёсцы Старое Сяло Віцебскага раёна ёсць унікальны школьны музей, дзе ў ліку іншых — экспанаты, якія расказваюць пра самага высокага чалавека на зямлі (Фёдар Махноў, які меў рост 2 метры 85 сантыметраў, а можа, і вышэй, бо дакладны рост пакуль што не ўстаноўлены, — ураджэнец гэтых мясцін). Гісторыя самой школы налічвае каля 150 гадоў — у 1865-м у вёсцы адкрылі народнае вучылішча — адзінае ва ўсёй Старасельскай воласці.**

Аўтар гэтых радкоў пабываў у школе напрыканцы жніўня. Спадзяваўся, што атрымаецца рэпартаж аб тым, як школа рыхтуецца да пачатку новага вучэбнага года і як старанна наводзяць парадак у школьным гісторыка-краязнаўчым музеі. Апошні адкрыўся ў 1982-м, а экспанаты і матэрыялы пачалі збіраць яшчэ напрыканцы 1960-х. У 1994 годзе музею было прысвоена званне народны. Па падборы экспанатаў і канцэпцыі ён па праве лічыцца адным з вядучых не толькі ў раёне. Быццам бы музеем можна ганарыцца. Але...

### «Мне сорамна гэта паказваць»

Краязнаўца Маргарыта Юшкевіч, якая з'яўляецца стваральніцай і захавальніцай музея, калі патэлефанаваў ёй, каб паведаміць, што прыеду пісаць артыкул пра ўнікальны музей, параіла... гэтага не рабіць.

— Мне сорамна вам гэта паказваць, — сказала яна. — Усё ў такім беспарадку, рамонт у музеі зацягнуўся...

Пасля гэтых слоў я літаральна напрасіўся ў госці. Ехаць да вёскі недалёка, яна ўсяго за кіламетраў 20 ад Віцебска. Ужо падчас размовы з Маргарытай Дзмітрыеўнай, якая ў ліку іншых напісала цудоўную кнігу «Праз гады і стагоддзі. Летапіс Старасельскага краю», зразумеў, чаму сустракае не так гасцінна.

Музей «працуе» на першым паверсе школы ў некалькіх пакоях, непадалёку ад кабінета дырэктара. Адразу кінуўся ў вочы беспарадак. Ля ложка велікана стаялі прыхіленыя да сцяны нейкія фотаздымкі пад шклом. Каменныя ядры для гарматы, якія знайшлі вучні, ляжалі на паліцы, патэфон і чамусьці глобус — побач з кроснамі. Колькі сіл і цярпення школьнікі і настаўнікі патрацілі ў свой час, каб знайсці, стварыць, замацаваць экспанаты... Хацеў пабываць на месцы пахавання велікана, ды яно кіламетраў за 8 ад Старога Сяла і, паводле слоў краязнаўцы, нават пры добрым надвор'і даехаць па недагледжанай дарозе на «веліканаў хутар» — праблема.

— Вось інфармацыя пра яго, якая вас цікавіць, — сказала Маргарыта Дзмітрыеўна, паказваючы такі ж недагледжаны куточак музея.

### Школу рамантуюць, а музей?

Журналістаў цяжка здзівіць — прафесія ў нас такая. Але ж на гэты раз здзівіўся. Пра беларускага велікана столькі разоў пісалі. І ў Віцебску конкурс штогод праходзіць, падчас якога выбіраюць самага высокага чалавека. А ў музеі, дзе так старанна сабраны краязнаўцам экспанаты аб велікане, непарадак. А я, дурань, яшчэ перад паездкай думаў, што прывязу на памяць нейкія сувеніры пра велікана. Безумоўна, на сваім земляку тутэйшыя маглі б добра зарабляць, як гэта робяць на радзіме Мюнхгаўзена. Неабходна толькі жаданне. Але ў адказных асоб, напэўна, ёсць больш важныя задачы. А да велікана рукі не даходзяць.

Маргарыта Дзмітрыеўна Юшкевіч была і дырэктарам гэтай жа школы, і завучам. Выкладала гісторыю і геаграфію. Вучылася ў свой час на гісторыка-геаграфічным факультэце ў Магілёўскім універсітэце. Яна — аўтар многіх кніг, вершаў. Зараз піша чарговую — «Зямля ў дыме», дзе будзе раздзел і пра казахаў, якія па-геройску вызвалялі Старасельскі край ад захопнікаў падчас Вялікай Айчынай.

— Няма грошай, вось мы і «сядзім». Ні ў школы, ні ў раённым аддзеле адукацыі сродкаў няма, — кажа Маргарыта Дзмітрыеўна. — Вусна звярталася да аддзела адукацыі, прадстаўнік якога прыязджаў у музей. Пачула, што, можа, гадоў праз дзесяць нас і адрамантуюць. А ў школе рамонт у цэлым праходзіў нядрэнна, нават вокны новыя паставілі.

Пры ўсім гэтым, паводле слоў паважанай Маргарыты Юшкевіч, убачыць экспанаты, якія датычацца велікана, прыязджае шмат людзей.

— Але што ж я магу зрабіць? Я таксама, як і вам, раскажу турыстам, які ў нас стан спраў, — вельмі эмацыйна расказвае краязнаўца. — Я сама нічога зрабіць не магу, а запісацца на прыём да старшыні райвыканкама не адважваюся. Я і так увесь час укладала свае грошы ў рамонты, але цяпер у мяне такіх сродкаў няма. Трэба паклеіць сцены, падмазаць столі, стэнды ў парадак прывесці... Гэта вялікая праца. Але пасільная, думаю, для раёна.

### Невядомае аб вядомым

Хто толькі ні пісаў пра велікана. Многія — нават не пабываўшы ў музеі. Маргарыта Дзмітрыеўна расказала, што ў 1976-м, калі прыехала ў Віцебскі раён, пачула пра вялікага і цікавага чалавека, сваякоў якога на яго малой радзіме жыло нямала. Сустракалася з яго пляменніцай і пляменнікам. Да гэтага не было часу асабліва веліканам займацца. Але ў 1976-м жыхар Смаленска прыслаў ліст, дзе папракаў: чаму, маўляў, амерыканцы выпусцілі кнігу аб веліканах і там ёсць матэрыял, прысвечаны велікану Махнову са Старога Сяла, а беларусаў гэта не цікавіць? Маргарыта Дзмітрыеўна ўспамінае, што тады ёй стала сорамна. Пасля гэтага пачала вельмі шчыльна вывучаць «тэму велікана». Сустрэлася з усімі сваякамі, якія паблізу жылі. А тым, хто далей, пісала лісты. Праз гады пачала цікавіцца і тым, што ў інтэрнэце пішуць пра Махнова. Высветлілася: усялякую лухту. Таму больш у сусветным павуцінні ніякай інфармацыі не шукае. Адзначыла, дарэчы, што вельмі добра раскрыў тэму вядомы віцебскі краязнаўца Аркадзь Міхайлавіч Падліпскі.

— Але лічу, што гэтага мала, — гаворыць краязнаўца. — Пасля кнігі, якую пішу аб вайне, вазьмуся за кнігу аб велікане, каб яна абавязкова была ў абласной бібліятэцы. Камерцыйных мэт я ніколі не ставіла перад сабой.

— А ці праўда, што нейкі расіянін узяўся фінансаваць устаноўку помніка велікану ў натуральную велічыню?

— Была такая размова. Гэты чалавек прыязджаў да мяне з Масквы, дзе жыве і працуе. А звязаны з нашай вёскай толькі тым, што служыў у арміі ў дэсантных войсках у віцебскай дывізіі. Зараз ён арандуе зямлю ў сельсавеце — на беразе Заходняй Дзвіны. Сказаў, што ёсць грошы, каб зрабіць помнік велікану ў Старым Сяле. Але ж яшчэ пакуль не знойдзены такі дакумент, які б канкрэтна зацвярджаў рост велікана — 2 метры 85 сантыметраў ці болей... Тое, што напісана на магільным помніку, што гавораць сваякі, тое, што ёсць у календары за 1905 год — усё гэта не зусім дакладныя дакументы. Напісала ў архіў у Маскву, каб далі даведку. Атрымала адказ, што ў іх такога няма, а ёсць у архіве — у Санкт-Пецярбургу. Адтуль адказалі, што знайшлі патрэбную справу «Велікан Махноў», але ўнутры... яна пустая...

І зараз краязнаўца на «сувязі» з унукамі велікана. Толькі адзін унук памёр, быў мараком. Унучка Ала жыве ў Мінску — ёй ужо каля 80. Яшчэ адна ўнучка — у Разанскай вобласці, а больш за ўсё сваякоў у Гомельскай вобласці.

### Высокі рост — гэта хвароба?

Адзін з пляменнікаў велікана аднойчы прыехаў у музей. Дык ростам ён быў усяго 170 сантыметраў. Пляменніца Валянціна, якая жыве і цяпер у суседняй са Старым Сялом вёсцы, і брат яе, які жыў побач, у Лётцах, — невысокія. Выснова краязнаўцы: высокі рост не перадаецца з пакалення ў пакаленне, хутчэй за ўсё — гэта хвароба.

Краязнаўца нагадала, што Фёдар Андрэевіч Махноў нарадзіўся 6 (18) чэрвеня 1878 года ў невялікай вёсачцы Касцюкі. Памёр у 1912 годзе. Калі пабагацеў, купіў маёнтак у мясцовага памешчыка, які назаўсёды ад'язджаў у Францыю... У апошнія два гады жыцця Махноў вельмі дрэнна хадзіў: язвы на нагах адкрыліся і не загойваліся нават ад добрых лекаў, якія волат атрымліваў ад свайго былога цыркавога гаспадара з Германіі. Нямецкія ўрачы паставілі Махнову дыягназ: туберкулёз касцей ног. Ад чаго менавіта памёр — невядома. Нашы ўрачы думалі, што ён хварэў на «веліканізм» — гэта характэрна для ўсіх веліканаў. Па версіі сваякоў (і маёй таксама) велікан памёр зусім ад іншага. Перад смерцю, восенню, на 33-м годзе жыцця ён моцна прастудзіўся. Вылечыўся, але лёгкія, як і ногі, хранічна хварэлі. Таму пражыў толькі зіму і вясну, а ў чэрвені памёр... Магчыма, ад сухотаў ці ад больш страшнай хваробы. Перад смерцю жыў ужо не ў Касцюках, а на хутары, які атрымаў назву хутар Махнова.

— Яго шкілет быў прададзены мінскаму медыцынскаму інстытуту. Там вучыўся яго малодшы сын — адзін з двайнят, якія нарадзіліся ў той жа год, калі велікан памёр, — кажа Маргарыта Юшкевіч. — Ім было ўсяго па 6 месяцаў, калі бацькі не стала. І адзін з іх — Гаўрыла — потым вучыўся на медыка. Калі прафесар чытаў лекцыю пра веліканаў і назваў прозвішча Махноў, Гаўрыла сказаў, што гэта яго бацька. Зразумела, пачаўся ажыятаж. Студэнта выклікалі і папрасілі пагаварыць з маці: можа, сям'я пагодзіцца прадаць шкілет навуцы — для эксперыментальных мэтаў? Маці жыла небагата, таму і пагадзілася. Па шкілет з Мінска прыязджалі на спецыяльнай машыне, даставалі яго з магілы, праводзілі спецыяльнае даследаванне... Падчас вайны шкілет знік. Верагодней за ўсё, калі пачалі аднаўляць разбураны будынак інстытута, яго проста вывезлі на звалку разам са смеццем.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Віцебскі раён.*



Велікан Махноў.




Помнік на месцы пахавання велікана.

**Начальнік аддзела адукацыі Віцебскага райвыканкама Вольга Разанава:**

***— У старасельскай школе паэтапна вядзецца рамонт. У прыватнасці, мяняюць вокны, займаліся рознымі рамонтнымі работамі, у тым ліку і капітальнымі — рамантавалі дах. Калі завершыцца рамонт школы, абавязкова зоймемся рамонтам музея.***

**Калі і ў якім годзе будуць адрамантаваны памяшканні музея, начальнік раённай сістэмы адукацыі не агучыла. Але адзначыла, што просьба паскорыць гэты працэс абавязкова будзе ўлічана.**

# УНІКАЛЬНЫЯ КНІГІ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ ПРЫВЕЗЛІ З ГЕРМАНІІ Ў МІНСК

**Кнігі беларускага першадрукара з фонду Верхнялужыцкай навуковай бібліятэкі з нямецкага горада Герліца будуць прадстаўлены ў Нацыянальнай бібліятэцы на выставе «Францыск Скарына: падарожжа на Радзіму».**

Як паведамілі ў аддзеле галерэйна-выставачнай дзейнасці бібліятэкі, кнігі будуць экспанавацца 4-13 кастрычніка. Наведвальнікі змогуць убачыць 11 выданняў Скарыны, у тым ліку тыя, якіх няма ў зборах Беларусі, — кнігу «Бытие» з гравіраваным тытульным лістом, чатыры кнігі Царстваў са знакамітым партрэтам аўтара, а таксама першую Біблію, выдадзеную ў 1518-1519 гадах у Празе.

Выстава будзе праходзіць у рамках сумеснага праекта Міністэрства культуры і Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Беларусі.

**«Мінск-Навіны».**

# ЗНОЎ ХОЧАЦЦА Ў РЫМ!

**Магілёўскія тураператары падводзяць вынікі летняга сезона і фарміруюць прапановы на Каляды і Новы год.**

У параўнанні з пасткрызісным сезонам 2011 года, сёлетні прынёс прыбыткі: попыт на замежныя туры ўлетку падвоіўся, а на некаторых напрамках павялічыўся ўтрая.

— Напэўна, у людзей з'явіліся грошы на добры адпачынак, — каментуе дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Магілёўаблтурыст» Алена Карпенка. — Народ захацеў цывілізаванага і пазнавальнага адпачынку. У нас летам карысталася вялікім попытам уся Еўропа — Чэхія, Францыя, Іспанія, Італія. Эканамічныя аўтобусныя туры з экскурсійнымі праграмамі плюс невялікі адпачынак. Кошт паездкі — ад 250 еўра, у залежнасці ад насычанасці праграмы і ўзроўню сэрвісу.

Павялічылася колькасць ахвотных адпачыць на ўзбярэжжы Чорнага мора — у Крыме і ў Адэсе. Туды пацягнуліся і людзі, якія раней аддавалі перавагу Турцыі і Егіпту, але цяпер з-за кошту, які вырас істотна, не могуць сабе гэтага дазволіць.

Увосень папулярнасцю карыстаюцца экскурсійныя туры па Беларусі, у Кіеў і Санкт-Пецярбург. Яны даступныя па цане і ўносяць разнастайнасць у жыццё менавіта восеньскай парой. Між тым, магілёўскія турфірмы ўжо робяць прапановы на Каляды і Новы год.

— Продаж адкрыты, — сказала Алена Карпенка. — У асноўным набываюць туры еўрапейскага кірунку: ад 280 еўра будзе каштаваць перадкалядны тыдзень у Германіі, Чэхіі, Францыі. А вось у паўночныя краіны, напрыклад у Фінляндыю, паехаць будзе даражэй — прыкладна 600 еўра. Падобныя туры на Новы год, у тым ліку і вельмі цікавыя, ёсць і ў межах Беларусі.

**Ілона ІВАНОВА**.

# ФОТАВЫСТАВА Ў ГОНАР 1150-ГОДДЗЯ ПОЛАЦКА АДКРЫВАЕЦЦА Ў ПАРЫЖЫ

**Фотавыстава, прысвечаная 1150-годдзю Полацка, адкрылася ўчора ў штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы, паведаміла дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Тамара Джумантаева.**

1150-годдзе Полацка прызнана ЮНЕСКА адной з найважнейшых міжнародных памятных дат і ўключана гэтай міжнароднай арганізацыяй у каляндар 2012-2013 гадоў. Рашэнне было прынята на 36-й Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў Парыжы. Унясенне юбілею старажытнага беларускага горада ў ганаровы спіс сведчыць аб значнасці гэтай падзеі для сусветнай культуры. У сувязі з гэтым горад-юбіляр атрымаў магчымасць правесці выставу ў штаб-кватэры ЮНЕСКА.

У Парыжы прадстаўлена фотавыстава «Полацк старажытны — Полацк сучасны». Яе склалі больш як 60 работ фотажурналіста Ігара Супранёнка, якія расказваюць аб горадзе і гараджанах. Чатыры пары фатаграфій паказваюць адны і тыя ж аб'екты, знятыя з аднаго і таго ж пункта з розніцай у стагоддзе.

На думку Тамары Джумантаевай, фотавыстава адкрые наведвальнікам новыя грані беларускага горада, пакажа яго дынамічнае развіццё.

Экспазіцыя будзе экспанавацца па 9 кастрычніка.

**БЕЛТА.**

# ЛЕПШЫЯ ГРЫБНІКІ — БАНКІРЫ

**У Браслаўскім раёне адбыўся конкурс «Браслаўскі грыб-2012». Інакш як алімпіядай гэты фэст, які праводзіцца вось ужо другі год запар, не назавеш. Як на сапраўднай алімпіядзе, трэба было выконваць строгія ўмовы. Суддзі ўважліва сачылі, каб грыбнікі не парушалі правілы. У прыватнасці, у залік ад спартсменаў прымаліся толькі восем пэўных відаў грыбоў, а на вагу іх трэба было пакласці ў канкрэтны час...**



Фэст арганізавалі аддзел па справах моладзі, фізічнай культуры, спорту і турызму райвыканкама і раённая арганізацыя БРСМ. Удзельнічалі ў чэмпіянаце «Браслаўскі грыб-2012» каманды ўстаноў і арганізацый, сем'і, а таксама асобныя спартсмены. Усяго для ўдзелу ў спаборніцтвах зарэгістравалася 16 камандаў.

Падчас фестывалю адбывалася насычаная культурная праграма. Удзельнікам свята прапанавалі пасапернічаць у гульнях, адказаць на пытанні віктарыны.

Па выніках каманднага спаборніцтва «золата» дасталася прадстаўнікам Белаграпрамбанка, якія назбіралі больш за 39,6 кг грыбоў. «Сярэбраны медаль» у напружанай барацьбе заваявалі работнікі сельскагаспадарчага вытворчага кааператыву «Маяк Браслаўскі» — яны прадставілі журы больш за 35,1 кг грыбоў, а на трэцім месцы — калектыў хлебазавода (больш за 31,9 кг).

Уручылі прыз і за самы вялікі грыб — яго атрымала Кацярына Леановіч.

Юрый Сімановіч атрымаў прыз як самы ўдачлівы грыбнік: сабраў больш за 16 кілаграмаў. Асобна адзначылі самага ўдалага «спецыяліста» па зборы баравікоў: Браніслаў Юран назбіраў іх каля 30.

Цікава, што самаму маламу ўдзельніку мінулага свята ўсяго два гады.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




## «СТРАТЫ НЯМА»

Змяніліся часы: цяпер, калі спатрэбіцца сурокі зняць, прысушыць каго ці адвярнуць, супакоіць малую «крыксу», дык шаптуху не адшукаць... А раней жа ці не кожная вёска мела! І нават не адну, бо рознай спецыялізацыі: чараўніц, што зналіся з пэўнымі сіламі, людзі пабойваліся, тых, што лячылі — вельмі паважалі.

Узяць хоць бы нашу бабцю Наталлю... Няма ў Лучыне сям'і, дзе б яна за свае 98 (!) гадоў дзіця не ратавала! Светлай памяці, добрая жанчына была! І пісьменная. Без акуляраў чытала (дарэчы, да апошняга дня). І ўсё па-беларуску. З часам вёска стала «русіць», казаць «Пасха», «Крашчэнне», «Благавешчанне»... Баба ж Наталля свайго трымалася — «Вялікадня», «Вадохрышча», «Дабравесця», «Васілля» і г.д.

Зрэшты, зараз не пра яе, а пра Усцінню, пра варажбітку, якую (вядома ж, за вочы) звалі, як і «паложана» ў нас, па назве вёскі, з якой яна перасялілася: Пласкінка (а то і Плоскінь, калі заззлуюцца)...

Было прычын на яе злаваць. Але ж як каму прыпрэ — у мужыка «дах стане зносіць» ці конча спатрэбіцца ведаць «чым сэрца супакоіш», то беглі да яе, як падмецены: «Усціначка, памагай». А тая і рада: не задарма ж. Плату яна брала згодна з «тарыфнай сеткай на шкодных умовах працы»...

Ды і не толькі гэтую крыніцу даходаў мела: коз трымала (тады, дарэчы, у вёсцы моды на іх не было, цяперака — ёсць: на вяровачках людзі водзяць...). А Пласкінка, між іншым, не вадзіла — ведама, чараўніца! І не навязвала век: яны за ёй бегалі, як сабачкі. А часцей самі хадзілі да «лініі» (так у нас чыгунка завецца), самі на ўзбочынах пасвіліся. І самі ж потым вярталіся.

Але ж неяк вось затрымалася гаспадыня па сваіх варажбітных справах, прыйшла дадому, а коз... няма. Што рабіць? Схадзіла па іх да «лініі». Там таксама няма! Дзе яны ёсць, — яшчэ трэба даведацца. Зрэшты, ёй жа і карты ў рукі. Узяла іх, адзін раз «кінула», другі. Страты не паказваюць. Значыць, козы жывыя. А вось дзе знаходзяцца? Можа, нехта з вяскоўцаў знайшоў мацнейшага ведзьмака, з «вышэйшым разрадам», і ёй за нешта адпомсціў?

Кінула карты яшчэ раз: умяшання іншай сілы яны не паказваюць.

Трэба тады, вырашыла, да савецкай улады звяртацца. Яе прадстаўніком яшчэ ў 40-я ў нас аднаго мужыка прызначылі. І нават стрэльбу выдалі. З ёй, размахваючы прыкладам, ён у Рагачоўскі суд злачынцаў канваіраваў. Пераважна — жанчын, што калгасны мінімум не выпрацавалі. У іх — ці бачыце — дзеці хворыя-малыя... Прычыну знайшлі...

Дык якраз да гэтага адказнага Пласкінка і пайшла. Разам з ім наведалі двух падазраваных — гаспадароў, якія маглі быць замешаны ў крадзяжы. І ні з чым з іх падворкаў вярнуліся: ніякіх прыкметаў злачынства!

А справа ж супраць ночы ўжо. Расстроілася кабета, пайшла дадому, яшчэ раз звязалася «са сваімі», думала, нешта новае скажуць. Але ж не — ранейшае: «Страты няма» ды «Страты няма». А тут яшчэ на гарышчы — чуе — як быццам валтузня нейкая пачалася...

Вырашыла, што гэта вышэйшыя сілы — злуюцца на яе, бо колькі ж можна «даставаць» іх з нейкай драбязой?

Карацей, закрыла яна «канал сувязі» і легла спаць.

А прачнулася — зноў на гарышчы тупат. Ды яшчэ і галасы...

Тут яна не на жарт спужалася, бо «на сувязь» яшчэ не выходзіла, у кантакт не ўступала. Значыць, гэта не «свае»?

На вуліцу выскачыла. Глядзіць і вачам не верыць: на даху, на сенцах... козы стаяць. Ну, вядома ж, не чужыя... Як залезлі туды? Ды, відаць, па лесках. Балазе, невысока... А адтуль — на гарышча хаты, дзе і заначавалі. Проста ўсё. Складана стала ўніз, на зямлю спусціцца.

Але ж для Пласкінкі галоўнае было, што дома яны, што жывыя, што «вышэйшыя сілы» не падманулі яе: «страты няма».

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## НЕ ЎСЁ ТОЕ ЗОЛАТА...

Гэтая гісторыя — з дызельцягніка. Распавядала яе адна маладзіца, іншыя — аж заходзіліся ад смеху. З чаго? Слухайце.

«Нашай сямейцы летась так званы прэзідэнцкі дамок выдзелілі — паехалі з мужам глядзець. Ходзім па ім, дзверы адчыняем, зачыняем і аж сэрцы з грудзей ад радасці выскокваюць: пакоі прасторныя, светлыя, падаконнікі шырокія (вазонаў можна наставіць!), вада гарачая, ванна, прыбіральня ў хаце... А ўжо ж ручкі ў дзвярах! А ўжо ж ручкі! Прыгожыя, бліскучыя, «наварочаныя»... Як мне, дык найбольш яны даспадобы прыйшліся...

Але ж з-за іх якраз і непрыемнасць мела.

Вось перасяліліся мы, жывём. У выхадны з чалавекам у гарод пайшлі: буракі трэба было выкапаць, моркву ўбраць... Колькі там папрацавалі, кажу гаспадару: «Ты ўжо сам завяршай, а я пайду прыбяруся, падлогі памыю».

Зайшла ў хату і перш-наперш куды? Прабачце, у прыбіральню. Не забавілася там. А захацела выйсці — не магу. Не спрацоўвае ручка. І так яе круціла, і гэтак. Залатая, халера, бліcшчыць, а не паварочваецца, ну хоць ты плач! Але ж плачу, думаю, дакладна аніхто не пачуе. Трэба пагрукаць і пакрычаць.

Не паверыце: кулакі сабе збіла, голас сарвала — выніку аніякага.

Стамілася, села (добра, што хоць ёсць на што). Чую, гадзіннік у зале б'е 13, потым — палову на чатырнаццатую, пятнаццаць... Яшчэ раз крычу, грукаю, замярзаць ужо стала і слёзы з вачэй проста ручаём: бо шкада ж і мужыка, што адзін працуе, і часу змарнаванага, і падлогі, што дагэтуль стаіць нямытая, і сябе...

Нарэшце пасля 16-ці мужык у хату заходзіць. І з парога:

— Ты што, яшчэ не прыбралася? А я ўжо ўсе буракі ў склеп панасіў, маліннік у парадак прывёў.

Ахрыплым голасам «крычу»:

— Я ў прыбіральні. Выпусці! Каторую гадзіну сяджу — а табе не ў галаве, што жонкі не відаць. Я тут і памерці магла б... Ручку заела.

— Вось табе і залатая, — засмяяўся ён.

...Выходзіць, хай бы і сапраўды — жалезная была, абы працавала. Асабліва — у прыбіральні.

**Дзіна ДУБАДЗЕЛАВА,**
*в. Леніна, Добрушскі раён.*

## ЦЫРК НА ДРОЦЕ



Той, хто курыць, мяне зразумее: рэдкае задавальненне выйсці раніцой на балкон, засмаліць... Знаёмую варону ўбачыць — на верхняй папярэчыне антэнны. Важная птушка: сядзіць — хоць карціну пішы «Каркун у дазоры»...

Праўда, зазвычай і Каркуша побач круцілася. Дзе ж цяпер?

Зірнуў на старую бярозу, што расце непадалёк. Ага, яна ў гняздзечку, нібы тая квактуха. Добра бачная нават дзюбка. Можа, сфатаграфаваць? Пачаць з Каркуна?..

Пакуль хадзіў у пакой па «мыльніцу» ды разважаў, той зляцеў з антэны і, горда чыкіляючы па даху дзевяціпавярховіка, стаў выглядваць ежу (во ў каго вочы: і кузурку на зямлі заўважыць!)

Зрэшты, за ёй цяпер крылатым паляваць не трэба: многія гараджане раз-пораз кідаюць птушкам рэшткі ежы, семкі, крупы, ладныя кавалкі кабачкоў, гарбузоў...

Тады што ж Каркун — нешта доўга ён топчацца? І па саменькім краёчку даха... Як, крый Божа, самагубца перад... «проста з моста». Няўжо і вароны ідуць на гэтакі грэх? Не-е, не павінны, бо яны ж разумныя, гаспадарлівыя птушкі. Арлы, можна сказаць! Вось гэты — можа перад жоначкай захацеў пагарэзіць? Бач, як сапраўдны канатаходзец — перад першым самастойным крокам на... кабель, нацягнуты паміж суседнімі дамамі, на дрот... Дык гэта ж цырк!

Здымаю. Аб'ектыў — нават у ручным рэжыме — факусіруецца вельмі дрэнна. Спрабую аўтарэжым. Шкодзіць лішак святла...

А Каркун ужо гойдаецца на дроце — уніз галавою! Спехам цісну на кнопку затвора... Яшчэ раз... Яшчэ... А птушка — каб жа ведаць! — па-ранейшаму вісіць! І не кілбаскаю, а нацятаю стралой.

Да мяне, нарэшце, даходзіць: Каркун не бібікі б'е, не цыркачыць, а засяроджана палюе! Палюе, відаць, на нейкую ўвішную мышку, норка якой дзесьці пад бакавінай цаглянага падмурка. Чаму вісам, чаму з дроту? А таму што адсюль, збоку, назіраць і атакаваць намнога зручней. Геаметрыя!..

Сам кідок-атаку сфатаграфаваць не пашчасціла: вельмі ўжо хутка ўсё адбылося — вокамгненна...

Пасля чаго са здабычай Каркун паляцеў (ці трэба казаць?) на бярозу — дамоў. Бо ўсё ў птушак, як у людзей: ёсць гаспадыня, ёсць — гаспадар. А значыць — здабытчык!

**Анатоль БІГАЙДАРАЎ (фота аўтара),**
*г. Гомель*

## СЯБРЫ, ДЫ НЕ ЎСЕ!

Дзеду Піліпу за 80. Працаваў пасля вайны ў калгасе, пракладваў дарогі, будаваў масты, а перад пенсіяй і гадоў колькі потым — гадаваў карпаў у сажалках свайго рыбгаса. Якраз тады і здарылася з ім гэтая не зусім звычайная гісторыя.

Падплыў на досвітку Піліп Іванавіч на сваім службовым катамаране да складскога памяшкання, загрузіў яго камбікормам, потым, адпіхнуўшыся вяслом ад берага, пачаў карміць сваіх гадаванцаў: шуфлем па абодва бакі шырокай лодкі рассыпаў корм... І трэба бачыць было, як скакала вакол удзячная рыба! «Бач ты, акурат як галодная дзятва ў час вайны, — гаварыў сам сабе дзед Піліп і ў душы пачуваў сябе ледзь не дырэктарам вялікага дзіцячага садка, чалавекам вельмі паважаным, бо дзяржаўнае дабро абы-каму вартаваць не даверацць»...

Зрабіўшы справу, накарміўшы гадаванцаў, дзед запыніў катамаран ля залацістага ствала сасны-прыгажуні, з'еў заслужаны сняданак і, падклаўшы пад бок ватоўку, задрамаў. А чаму б і не, калі ведаеш, што пасля ранішняга кармлення рыба не вельмі пойдзе на розныя хітрыкі рыбаловаў-браканьераў, бо не галодная ж...

Ад сну вартаўніка абудзіў гул машыны, а потым рэзкія галасы людзей. Непадалёк на паляне пачынала баляваць ладная кампанія з маладых мужчын і кабет. На разасланым абрусе з'явілася багата пляшак, закускі. Тыя, што выпілі і нешта з'елі, ужо выцягвалі з багажнікаў вуды і спінінгі. Час быў дзейнічаць — пакуль не позна:

— Я тут пры службе — вартаўніком, а сажалка гэта — дзяржаўная, — строгім голасам прамовіў дзед Піліп, які ў вайну прайшоў і партызанку, і фронт, а таму нікога не баяўся. — Так што вам, людцы, дваццаць хвілін на зборы...

— Якая служба? Якая дзяржаўная сажалка? Не смяшы нас, дзед, — перапынілі яго мужыкі. — Дзе тут шыльда, дзе тваё пасведчанне? Ідзі во лепей чарку выпі. А мы пару вядзёр рыбы зловім сабе — і па руках. Згода?

(Дзеля праўды варта адзначыць, што на той час і сапраўды такіх немалаважных атрыбутаў рыбгаса, як шыльды і пасведчанні, не існавала. З'явіліся яны пазней, пасля такіх вось інцыдэнтаў).

— Калі вы зараз са сваімі машынамі не пакінеце бераг, — настойваў дзед, — я вымушаны буду паклікаць дэпутата.

— Каго-каго? — з боку прыезджай кампаніі раздаўся дружны рогат. — Ну ты даеш... Якога дэпутата, абарыген? Ты хоць ведаеш, дзе мы працуем? Ды ўсе дэпутаты — нашы сябры.

— Не, браточкі, не ўсе...

Дзед ведаў, што казаў: непадалёку на лужку і не прывязаны скуб траву яго... бычок па мянушцы (ну хай яны даруюць) Дэпутат. І варта яго паклікаць...

Бычок праз імгненне з'явіўся: пабачыў незнаёмых людзей, апусціў долу лабастую галаву, капытом капануў зямлю...

Прыезджыя ад нечаканасці, ад перапуду аж аслупянелі: шклянкі і вуды павыпадалі з рук. Жанчыны крычалі, нібы іх рэзалі. Асобныя падаліся ў бок вёскі — ды так, што пад нагамі аж застраляла ламачча — аўтаматнымі чэргамі.

— Дзед, бяры што хочаш, толькі адгані бычка, — напаміілы Бог папрасіў завадатар кампаніі.

Што было рабіць, стары пагадзіўся — пагладзіў свайго гадаванца па шыі, адвёў на ранейшае месца, а вярнуўшыся на пустую ўжо паляну, прыхапіў з сабою дзве бутэлькі гарэлкі і ладны кавалак каўбасы. «Хай і ў мой гарляк кропля трапіць. Усё ж такі перахваляваўся, ліха іх бяры...».

**Сяргей КУЛАКЕВІЧ,**
*г. Жыткавічы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменения в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта **«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 17 по генплану»** в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» от 07.06.2012 № 107:

**Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – 31 мая 2013 года.**

*Генеральный директор Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменения в проектную декларацию о строительстве нежилых помещений объекта **«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 13 по генплану»** в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» от 22 марта 2011 года № 52:

**Ожидаемый ввод в эксплуатацию нежилых помещений, расположенных во 2 – 9 пусковых комплексах жилого дома, – 05 декабря 2012 года.**

*Генеральный директор Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

**ООО «Кеакан»**
**реализует следующие объекты недвижимости**

УНП 190835126

| Наименование | Расположение | м² | Цена |
|---|---|---|---|
| Административное помещение | г. Минск, ул. Краснозвездная, д. 9 | 227 | 1 360 000 000 |
| Торгово-административное здание | г. Минск, ул. Жудро, д. 71А | 330 | 2 800 000 000 |
| Административно-производственное здание | г. Минск, ул. Менделеева, д. 50/2 | 811 | 5 525 000 000 |

**Телефоны для справок: (8017) 237 57 93, (8 029) 697 57 93**

ООО «ДинасИстейт»
сообщает о внесении дополнений в проектную декларацию,
опубликованную в газете «Звязда» № 167 (27282) от 30.08.2012 г.

Объект: «Многоквартирные жилые дома, не относящиеся к домам повышенной комфортности, с помещениями административно-общественного назначения, выносом временной автостоянки УП «Гаражи, автостоянки и парковки» на пересечении ул. Крупской и ул. Малинина с многоярусной гараж-стоянкой по ул. Крупской, первый этап – строительство жилых домов №№ 9, 10, 11 и 12 по генплану».

Дополнительно предлагается для заключения договора создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 9 по генплану однокомнатная квартира общей площадью 48,79 м².

Условия оплаты стоимости объекта долевого строительства:

Не менее 50 % стоимости объекта долевого строительства подлежит оплате не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня регистрации договора долевого строительства. Оставшаяся часть стоимости подлежит оплате не позднее января 2013 г. с индексацией каждого платежа в соответствии с изменением статистического индекса СМР, утверждаемого МАиС РБ по отношению к августу 2012 г.

УНП 100984486

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменения в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта **«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 13 по генплану»** в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» от 11 августа 2010 года № 155:

**Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – 15 октября 2012 года.**

*Генеральный директор Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

**КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**
**18 октября 2012 года**
**ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ ОАО «Ивацевичдрев»:**

УНП 290433924

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-1278 (служебно-бытовой корпус) площадью 4 094,3 кв.м (семиэтажное здание: фундамент свайный железобетонный, стены и перегородки кирпичные и гипсовые, железобетонные перекрытия, кровля рулонная совмещенная, год постройки 1983), расположенное по адресу: г. Брест, ул. Краснознаменная, д. 2. Начальная цена продажи **24 079 200 000 руб.**

Полная информация об аукционных торгах по тел.:
**(0162) 23 81 92, (0162) 23 42 60.** Сайт: **bgcn.by, city.brest.by**

**К сведению акционеров ОАО «Белсельэлектросетьстрой»**

Открытое акционерное общество «Белсельэлектросетьстрой» (г. Минск, ул. Сухая, 3, тел. 226 66 47) расторгает с 01.12.2012 договор на депозитарное обслуживание эмитента с обществом с ограниченной ответственностью «Каскад-93-Инвест» (г. Минск, ул. Володько, 6-18, тел. 298 57 68, 298 59 52) и заключает новый договор на депозитарное обслуживание эмитента с отрытым акционерным обществом «Белагропромбанк» (г. Минск, пр. Жукова, 3, тел. 229 63 24, 229 64 50, 229 64 51) с 01.12.2012.

УНН 100120777

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Пуховичского райпо (продавец) ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, расположенных по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Гучка, д. 123, в составе:**

**здание рыбо-колбасного цеха** (инв. № 602/С-22152), об. пл. 923,4 кв.м; **навес РКЦ** (инв. № 602/С-43157), об. пл. 155,2 кв.м (ул. Гучка, д. 123/3); **склад-гараж** (602/С-43155), об. пл. 125,8 кв.м (ул. Гучка, д. 123/5); **гараж РКЦ** (инв. № 602/С-43154), об. пл. 107,3 кв.м (ул. Гучка, д. 123/2); **мастерская РКЦ** (инв. № 602/С-43153), об. пл. 84,3 кв.м (ул. Гучка, д. 123/4); **проходная колбасного цеха РКЦ** (инв. № 602/С43156), об. пл. 14,8 кв.м (ул. Гучка, д. 123/1).

**Начальная цена с НДС – 1 000 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,9173 га**
(предоставлен продавцу на праве аренды по 11.11.2040).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **5** (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение **30** (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 05.05.2012.*

Аукцион состоится **12.10.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.10.2012** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

**Извещение о проведении аукциона по продаже недвижимого имущества, находящегося в республиканской собственности**

**Организатор аукциона:**
фонд «Минскоблгосимущество»,
г. Минск, ул. Чкалова, 5,
тел.: (8017) 228-60-13, 224-39-76, 500-47-10
**Место проведения аукциона:**
г. Минск, ул. Чкалова, 5
Дата и время проведения аукциона:
**5 ноября 2012 г. в 11.00**

**Лот № 1**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 601/С-8056) – трехэтажное **здание казармы № 4/125** с двумя террасами и подвалом, общая площадь 2490,7 кв.м, 1983 года постройки, фундамент бетонный, стены и перегородки панельные, стены облицованы плиткой, перекрытия железобетонные, крыша совмещенная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,4220 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы № 4/125. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 50 лет со дня государственной регистрации права аренды земельного участка в территориальной организации по государственной регистрации. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

**Начальная цена предмета аукциона: 611 842 613** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 50 %.* **Размер задатка: 120 000 000** рублей.

**Лот № 2**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 601/С-8036) – трехэтажное **здание казармы № 4/127** с двумя террасами и подвалом, общая площадь 2449,9 кв.м, 1984 года постройки, фундамент бетонный, стены блочные, облицованы плиткой, перегородки панельные, перекрытия железобетонные, крыша совмещенная рулонная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,2360 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы № 4/127. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 50 лет со дня государственной регистрации права аренды земельного участка в территориальной организации по государственной регистрации. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

**Начальная цена предмета аукциона: 702 684 233** рубля. *Начальная цена продажи объекта понижена на 50 %.* **Размер задатка: 140 000 000** рублей.

**Лот № 3**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 601/С-8073) – трехэтажное **здание казармы № 4/139** с подвалом, общая площадь 3813,4 кв.м, 1987 года постройки, фундамент – фундаментные стаканы, блоки, стены – железобетонные панели, железобетонный каркас, облицованы плиткой, перегородки кирпичные, перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная. Имеются бетонные крыльца (63 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 0,2515 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы № 4/139. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 50 лет со дня государственной регистрации права аренды земельного участка в территориальной организации по государственной регистрации. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

**Начальная цена предмета аукциона: 1 358 886 827** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 50 %.* **Размер задатка: 200 000 000** рублей.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона **(по Лотам №№ 1–3)** необходимо в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды обратиться за государственной регистрацией возникновения прав на земельный участок.

**Продавец (Лоты №№ 1–3):** государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Минская обл., г. Борисов, ул. Л. Чаловской, 26, тел. 8(0177) 757659, 733349). **Арендодатель земельных участков (Лоты №№ 1–3):** Логойский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Логойск, ул. Советская, 15, тел. (801774) 55141).

**Лот № 4**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 613/С-7907) – одноэтажное **здание хранилища техники** общей площадью 1515,4 кв.м, 1986 года постройки, фундамент железобетонный, стены кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Объект расположен на земельном участке площадью 0,4793 га по адресу: Минская обл., г. Крупки, военный городок № 3, назначение: земельный участок для обслуживания здания хранилища техники. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 25 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для производственных целей с размещением производственных, административно-бытовых и складских зданий (помещений). Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо: осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона; получить в установленном порядке разрешение Крупского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ по реконструкции существующего объекта или строительству нового объекта; осуществить реконструкцию (строительство) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; снимаемый плодородный слой использовать для нужд, связанных со строительством объекта (благоустройство и озеленение); произвести благоустройство прилегающей территории и строительство внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно разработанной и утвержденной проектной документации.

**Начальная цена предмета аукциона: 494 923 414** рублей. **Размер задатка: 90 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 2 271 795 рублей (с НДС 20 %).

**Продавец:** государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Минская обл., г. Борисов, ул. Л. Чаловской, 26, тел. 8(0177) 757659, 733349). **Арендодатель земельного участка:** Крупский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Крупки, ул. Советская, 8, тел. (801796) 55663).

**Лот № 5**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 610/С-44118) – одно-двухэтажное **здание цеха по переработке сельскохозяйственной продукции** (цех безалкогольных напитков и картофельный цех) с тремя пристройками, общая площадь 1157,2 кв.м, 1895/1945 года постройки, фундамент бетонный, стены кирпичные, блоки, камни, перегородки кирпичные, перекрытия (чердачное и междуэтажное) бетонные, крыша железная. Принадлежности: бутобетонный отстойник (40 кв.м), асфальтовая дорожка (529 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 3,9920 га по адресу: Минская обл., Борисовский район, дер. Воровского, назначение: земельный участок для обслуживания цеха по переработке сельскохозяйственной продукции. Введены ограничения в использовании земельного участка в связи с нахождением в водоохранной зоне малых рек. Земельный участок предоставляется в аренду сроком по 18 марта 2042 г. **Условия использования земельного участка:** разрешено использовать земельный участок для обслуживания здания с возможным изменением направления его использования в установленном порядке – создание на базе приобретенного имущества объекта агроэкотуризма или производственного предприятия с санитарно-защитной зоной до 100 метров. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо: в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона осуществить государственную регистрацию договора аренды земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок; получить в установленном порядке разрешение Борисовского районного исполнительного комитета, архитектурно-планировочное задание (АПЗ) и заключения (технические условия) заинтересованных служб на проектирование и строительство (реконструкцию) объекта; осуществить реконструкцию (строительство) объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией; снимаемый плодородный слой использовать для нужд, связанных со строительством объектов (благоустройство и озеленение); произвести благоустройство прилегающей территории и строительство внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно разработанной и утвержденной проектной документации.

**Начальная цена предмета аукциона: 110 404 630** рублей. *Начальная цена продажи понижена на 50 %.* **Размер задатка: 20 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 012 114 рублей (с НДС 20 %).

**Продавец:** производственное унитарное предприятие «Бумажная фабрика» Департамента государственных знаков Министерства финансов Республики Беларусь (Минская обл., г. Борисов, ул. Заводская, 55, тел. (80177) 781446, 781312, 781296). **Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, тел. (80177) 34016).

**Лот № 6**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 645/С-6643) – одноэтажное **здание насосной станции** общей площадью 59,3 кв.м, 1966 года постройки, фундамент бутобетонный ленточный, стены кирпичные, чердачное перекрытие – деревянные балки с настилом из досок, крыша шиферная двухскатная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1613 га по адресу: Минская обл., г. Старые Дороги, ул. Советская, д. 5, назначение: земельный участок для обслуживания зданий и сооружений. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения торгового объекта и оказания услуг населению. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо: в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды обратиться за государственной регистрацией возникновения права на земельный участок; совместно со Стародорожским исполнительным комитетом по истечении срока аренды в установленном порядке решить вопрос о дальнейшем использовании земельного участка.

**Начальная цена предмета аукциона: 23 921 674** рубля. *Начальная цена продажи объекта понижена на 20 %.* **Размер задатка: 4 000 000** рублей.

**Продавец:** республиканское производственное унитарное предприятие «Дорводоканал» (г. Минск, ул. Брест-Литовская, 12, тел. (8017) 2250641, 2254513, 2253020). **Арендодатель земельного участка:** Стародорожский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Старые Дороги, ул. Пролетарская, 38, тел. (801792) 55539).

**Лот № 7**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 631/С-12361) – одноэтажное **здание отделения связи** с пристройкой, общая площадь 48,9 кв.м, 1960 года постройки, фундамент бутовый, стены бревенчатые, перегородки деревянные, чердачное перекрытие деревянное, крыша шиферная. Принадлежности: дощатые сарай (8 кв.м) и уборная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,0712 га по адресу: Минская обл., Вилейский район, дер. Костеневичи, ул. Центральная. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 99 лет. **Условия использования земельного участка:** разрешено использовать земельный участок для размещения объектов административного назначения либо объектов жилой застройки. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо: в двухмесячный срок с момента заключения договора аренды земельного участка обеспечить государственную регистрацию права на земельный участок; при необходимости в течение двух месяцев после заключения договора аренды земельного участка обеспечить в установленном порядке выполнение работ по восстановлению границ земельного участка на местности; приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев – для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, а для граждан – в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка); соблюдать права и обязанности землепользователей, установленные Кодексом Республики Беларусь о земле; осуществлять всякое строительство, реконструкцию строений и сооружений в соответствии с законодательством Республики Беларусь; содержать предоставленный участок и прилегающую к нему территорию в надлежащем санитарном состоянии; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий два года (в случае изменения назначения недвижимого имущества); осуществить строительство (реконструкцию) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией (в случае изменения назначения недвижимого имущества).

**Начальная цена предмета аукциона: 19 561 835** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 50 %.* **Размер задатка: 3 000 000** рублей.

**Продавец:** республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта» (Минский филиал, г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3, тел. (8017) 2227585, 2243202, 2132818). **Арендодатель земельного участка:** Вилейский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Вилейка, ул. Партизанская, 40, тел. (801771) 55161).

**Лот № 8**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 623/С-740) – одноэтажное **здание отделения почтовой связи** с верандой, общая площадь 48,4 кв.м, 1948 года постройки, фундамент бутовый, стены бревенчатые, перегородки дощатые, чердачное перекрытие деревянное, крыша шиферная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,0252 га по адресу: Минская обл., Узденский район, дер. Валерьяны, назначение: для обслуживания и эксплуатации строений в дер. Валерьяны. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 99 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов рекреационного назначения, спорта и туризма, административных, общественных и жилых зданий, предприятий по обслуживанию населения и других производств, размещение которых допускается в зоне жилой застройки. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией возникновения прав на земельный участок.

**Начальная цена предмета аукциона: 16 501 283** рубля. *Начальная цена продажи объекта понижена на 50 %.* **Размер задатка: 3 000 000** рублей.

**Продавец:** республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта» (Минский филиал, г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3, тел. (8017) 2227585, 2243202, 2132818). **Арендодатель земельного участка:** Узденский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Узда, ул. Советская, 22, тел. (801718) 734016).

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 1 ноября 2012 г.** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **1 ноября 2012 г. до 12.00.**

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется на текущий (расчетный) счет № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». **Назначение платежа:** ***задаток для участия в аукционе.***

Участник аукциона, желающий принять участие в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задаток по каждому лоту.

**Заявления на участие в аукционе** с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 310, 312.**

Информация о предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности» и Указа Президента Республики Беларусь от 4 июля 2012 г. № 294 «О порядке распоряжения государственным имуществом».

Земельные участки предоставляется победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды.

Для участия в аукционе в указанные в извещении сроки необходимо подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан:

1. подписать протокол о результатах аукциона; 2. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка; 3. после совершения названных действий и представления организатору аукциона, продавцу, и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества может быть предоставлена в соответствии с действующим законодательством.

**ИНФОРМАЦИЯ**
**О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА**

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | **Здание склада запчастей.** Общая площадь 362,8 кв.м, год постройки 1966. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б/2. **Начальная цена: 383 671 080 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. **Лесопильный цех.** Общая площадь 342,4 кв.м, год постройки 1977. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б/4. **Начальная цена: 336 763 170 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Сумма задатка** | 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Продавец** | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **22.10.2012 г., до 16.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8-0176) 73-00-13, (факс) 75-19-20, 8-044 710-74-60 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **23.10.2011 г. в 15.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис» |

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.
Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 28 (450)

# Як перасадзіць расліны на іншае месца

**Бяром пустацелы цыліндр, на ўнутраны бок якога наляпляем тканіну, папярэдне змочаную вадой ці намазаную (палоскамі) салідолам.**

Канцы тканіны загортваем на верх цыліндра і трывала замацоўваем шпагатам. Надзяваем цыліндр на ствол так, каб не пашкодзіць галінкі, і ўціскаем яго ў грунт.

Затым асцярожна адкопваем вакол зямлю і паступова заглыбляем цыліндр да развітых каранёў. Дробныя адгалінаванні запраўляем унутр ёмістасці. Вялікія або загінаем у цыліндр, або абразаем.

Захапіўшы карані цалкам, ніжнія канцы тканіны вызваляем ад шпагату, падгінаем іх пад карані з зямлёй і, перавярнуўшы цыліндр, завязваем тканіну.

Пасля гэтага кантэйнер пераносім на новае месца пасадкі і апускаем у падрыхтаваную яму. Шпагат развязваем, канцы тканіны прышпільваем драўлянымі ці металічнымі крукамі да дна ямы і прыціскаем нагамі да зямлі.

Рукі размяшчаем у ніжняй частцы кантэйнера паміж тканінай і цыліндрам і асцярожна здымаем яго, імкнучыся не разбурыць ком зямлі вакол каранёў і не пашкодзіць ствол і галінкі.

Тканіну прымаць неабавязкова, яна дапаможа захаваць грунт вакол каранёў. Яму засыпаем і паліваем.

Так можна перасаджваць расліны ва ўзросце ад 1 года да 5 гадоў увосень, увесну і ўлетку. Пасля падобнай перасадкі асабліва добра прыжываюцца яблыня, груша, арэх, кусты.

# Раптам спатрэбіцца

✓Калі вы квасіце капусту ў бочцы, а за лета ў ёй з'явіўся пах гніласці, скарыстайце правераны спосаб выпраўлення сітуацыі. У бочку наліце літраў 6-7 вады, пакладзіце галінкі ядлоўцу. Нагрэйце камень на агні і кіньце яго ў бочку з вадой і ядлоўцам. Хутка накрыйце коўдрай ці чымсьці тоўстым. Калі вада астыне, выліце яе, і бочка — без паху.

✓Салома — рэч добрая. Але не трэба перасцілаць ёю яблыкі, як гэта часта раяць. Пры з'яўленні гніласці ці кандэнсату, салома плеснее і надае пладам прысмак, ад якога есці іх ужо не хочацца.

# «Сусед-украінец прыйшоў па дыню»

**Калі зірнуць, як той казаў, у глыбіню часоў, дык вырошчванне кавуноў для Беларусі вялікай экзотыкай не назавеш: некалі яны былі дастаткова звыклай ягадай для многіх панскіх сядзіб. А апошнім часам гэтая мода пакрысе пачала вяртацца і ў сучасныя вёскі.**

— У нашай сям'і вырошчванне кавуноў і дынь стала ўжо сямейнай традыцыяй. Мая свякроў Надзея Гаўрылаўна Каралёва займаецца імі гадоў пяць, — расказала работніца рэдакцыі Тамара Петрыкевіч. — Высаджвае абедзве культуры ў адкрыты грунт семкамі, якія нават не замочвае — як звычайныя агуркі. Укрываем градкі спанбондам — ажно да самага цвіцення. Ніякіх падкормак, звычайны паліў.

Здавалася б, нічога складанага. Аднак чамусьці больш ніхто ў вёсцы Абчак пад Мінскам кавуны і дыні не вырошчвае — яны растуць толькі на лецішчы свекрыві Тамары. Хоць, расказвае тая далей, дыні спрабаваў вырошчваць сусед-украінец. Думалася, поспех забяспечаны! Але ж не, сусед неўзабаве прыйшоў з просьбай пачаставаць бахчавай культурай: сваё не парасло. На што Надзея Гаўрылаўна вынесла вердыкт: праполваць градку трэба было! Хоць ёсць думка, што ў траве многія культуры растуць нават лепш.

Дыні гатунку «Ранні» растуць па кілаграму-паўтара. Смачныя, сакавітыя, салодкія, з танюткай лупінай — гэта я сам паспытаў. Такімі ж салодкімі атрымліваюцца і кавуны гатунку «Агеньчык». Ягады звычайна вырастаюць да 2-2,5 кілаграма.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**



■ Інфарм-укол

# НАВОШТА ПРЫМАЦЬ СТАЦІНЫ?

**Знізіць узровень халестэрыну ў крыві не заўсёды ўдаецца адной толькі дыетай і зніжэннем масы цела. Апошнім часам настойліва рэкламуюцца самыя розныя вітаміны і харчовыя дабаўкі, прыём якіх нібыта прыводзіць да зніжэння ўзроўню халестэрыну і вылечванню ад атэрасклерозу. Ці так гэта на самай справе?**

Харчовыя дабаўкі, як вядома, не лекі. Напрыклад, Брытанская дыетычная асацыяцыя рэкамендуе вітаміны і харчовыя дабаўкі з мінераламі асобам так званай катэгорыі рызыкі, а таксама ў тых выпадках, калі карысць для хворага даказана сур'ёзнымі навуковымі даследаваннямі. Да катэгорыі рызыкі адносяцца неданошаныя дзеці, цяжарныя і кормячыя жанчыны, спартсмены, вегетарыянцы, пажылыя людзі, курцы, асобы, якія злоўжываюць алкаголем, людзі, схільныя да астэапарозу і інш. Прымяненне ж харчовых дабавак пры вострых захворваннях або абвастрэнні хранічных хваробаў павінна ўзгадняцца з урачом, паколькі патрабуе асаблівага кантролю з боку спецыялістаў.

Паводле слоў **загадчыцы інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталлі ПАЛЯЎКОВАЙ,** сучасная медыцына не валодае дастатковай колькасцю абгрунтаваных навуковых даных, якія б даказвалі, што прыём вітамінаў, антыаксідантаў і іншых харчовых дабавак папярэджвае развіццё атэрасклерозу, не гаворачы ўжо пра лячэбнае дзеянне. Лячэнне атэрасклерозу — вельмі складаная задача. Працэсы, якія прыводзяць да развіцця атэрасклерозу, пачынаюцца яшчэ ў маладым узросце і доўжацца многія гады, таму на хуткі эфект разлічваць не даводзіцца. Рост атэрасклератычнай бляшкі па розных звестак працягваецца ад 10 да 40 гадоў, і для таго, каб павярнуць гэты працэс у адваротны бок, патрабуюцца не месяцы, а гады лячэння.

Каб спыніць прагрэсаванне атэрасклерозу і стварыць перадумовы для яго адваротнага развіцця, патрабуецца знізіць «дрэнны» халестэрын на 25-40 працэнтаў ад зыходнага значэння і падтрымліваць гэты ўзровень вельмі доўга. Менавіта таму адначасова з дыетай абавязкова павінны выкарыстоўвацца сучасныя і высокаэфектыўныя прэпараты для лячэння атэрасклерозу. Сёння найбольш распаўсюджанымі ў свеце з'яўляюцца прэпараты для зніжэння халестэрыну з групы так званых стацінаў. Іх асноўнае дзеянне заключаецца ў тым, што яны не дазваляюць утварацца «дрэннаму» халестэрыну ў печані — і гэта прыводзіць да зніжэння яго ўзроўню ў крыві на 25-60 працэнтаў. У такіх умовах халестэрын, які ўжо знаходзіцца ў органах, пачынае з іх выходзіць, у тым ліку і з атэрасклератычных бляшак.

Упершыню яшчэ ў 2001 годзе ў межах аднаго даследавання было даказана, што працяглы прыём аднаго са стацінаў дазваляе знізіць смяротнасць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў атэрасклератычнага паходжання нават у тых пацыентаў, якія ўжо знаходзіліся ў групе рызыкі. Гэта хворыя з цукровым дыябетам, перамежкавым кульганнем, артэрыяльнай гіпертаніяй, інфарктам міякарда або інсультам.

Такім чынам, стаціны — лідары ў лячэнні атэрасклерозу. Па сутнасці, стаціны пры лячэнні атэрасклерозу — усё роўна што антыбіётыкі пры лячэнні пнеўманіі.

Для падбору неабходнага прэпарата, які зніжае халестэрын, падбору аптымальнай дозы, вызначэння зыходнага ўзроўню ліпідаў і параметраў бяспекі, урач павінен накіраваць пацыента на лабараторнае даследаванне крыві. Для атрымання правільнага выніку ў дзень здачы аналізу крыві неабходна прыехаць у клініку нашча. Апошні прыём ежы павінен быць не менш як за 12-14 гадзін, алкаголю — за 72 гадзіны.

Пасля супастаўлення паказчыкаў агульнага, «добрага» і «дрэннага» халестэрыну, з улікам фактараў рызыкі ўрач парэкамендуе немедыкаментозную тэрапію, дасць парады адносна зніжэння масы цела, падбярэ дыету, абазначыць аб'ём фізічнай актыўнасці. Толькі ў выпадку неабходнасці спецыяліст прызначыць медыкаментозны прэпарат для зніжэння ўзроўню ліпідаў (халестэрыну).

На працягу месяца, як правіла, высвятляецца, наколькі бяспечны рэкамендаваны сродак для канкрэтнага пацыента. Эфектыўнасць прэпарата ў дачыненні да халестэрыну ацэньваецца, як правіла, не раней чым праз 3 месяцы пастаяннага ўжывання.

**Прыкладныя тэрміны, калі можна чакаць станоўчых змен пасля пачатку прыёму стацінаў:**

2 тыдні — станоўчыя змены ў эндатэліі (унутранай высцілцы сасудаў). Змяненняў у самаадчуванні пакуль няма;

6 месяцаў — можна адзначаць змяншэнне колькасці боляў у сэрцы, што адбіваецца на выніках тэста на велаэргометры;

1 год — можа істотна зменшыцца колькасць і інтэнсіўнасць боляў у сэрцы. Гэта мінімальны тэрмін для кантрольнага даследавання стану атэрасклератычных бляшак у буйных сасудах шыі;

звыш 2 гадоў — можна разлічваць на спыненне далейшага развіцця атэрасклерозу ў сасудах сэрца;

звыш 5 гадоў — зніжэнне сардэчна-сасудзістай смяротнасці на 30 працэнтаў і агульнай смяротнасці на 20 працэнтаў пры ўмове рэгулярнага прыёму прэпаратаў.

Некаторыя тыповыя забабоны ў сэнсе зніжэння халестэрыну і лячэння стацінамі.

**Навуковыя даныя, атрыманыя ў апошнія гады, пераканаўча сведчаць, што няма ніякіх падстаў думаць, што:**

— зніжэнне халестэрыну прыводзіць да павелічэння агрэсіўнасці, дэпрэсій і анкалагічных захворванняў;

— пасля вымушанай адмены стацінаў адбываецца рэзкі выкід халестэрыну з печані;

— вытрымліванне дыеты дастаткова для лячэння атэрасклерозу;

— стаціны небяспечныя для печані;

— усе стаціны аднолькавыя;

— прыём стацінаў выклікае прывыканне (на прэпарат можна «падсесці»);

— карысны толькі пажыццёвы прыём халестэрыназніжальных прэпаратаў;

— выкарыстанне некаторых «цудадзейных» сродкаў здольнае «ачысціць» сасуды або «поўнасцю рассмактаць» атэрасклератычныя бляшкі;

— пасля аперацыі на сасудах сэрца можна не прымаць прэпараты, якія зніжаюць халестэрын.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# Што з морквай?

**Амаль усе гаспадары ўжо сабралі ўраджай агароднiны са сваіх градак. У тым ліку і морквы. Але не ўсіх ён парадаваў. У многіх морква сёлета не вельмі добрая, з прыкметамі розных захворванняў. А яе ж яшчэ трэба захоўваць да наступнага ўраджаю. Давайце разбірацца з захворваннямі і спосабамі абароны ад іх.**

**Белая, шэрая і чорная гнілі.** Гэта грыбковыя захворванні, якія часцей за ўсё праяўляюцца пры захоўванні. Траўмаваныя ці падмарожаныя караняплоды становяцца лёгкай здабычай белай гнілі. На іх з'яўляецца белы пушок, пад якім тканіна размякчаецца, становіцца слізкай. Калі пры захоўванні тэмпература і вільготнасць вышэй нормы (1-2°С і 85-90%), хвароба хутка распаўсюджваецца і спыніць яе цяжка. Асабліва часта хварэюць караняплоды, якія выраслі на вільготных участках, пры ўнясенні вялікіх доз азоту. Крыніца інфекцыі — заражаная глеба.

Пры пашкоджанні шэрай гніллю тканка караняплода становіцца мяккай, мокрай, як і пры белай гнілі, але, у адрозненне ад яе на паверхні развіваецца шэры налёт. Споры грыба, якія знаходзяцца там, заражаюць суседнія караняплоды. Шэрая гніль асабліва бурна развіваецца пры захоўванні морквы разам з капустай.

**Чорная гніль** выяўляецца ў перыяд росту і захоўвання. Пагібельная для ўсходаў (чорная ножка), на дарослых раслінах распазнаць яе цяжка, відавочнай становіцца толькі пры захоўванні. На караняплодах з'яўляюцца сухія цёмныя плямы, злёгку ўціснутыя. На разрэзе можна ўбачыць вугальна-чорную пашкоджаную тканку. Крыніца інфекцыі — насенне, пасляўборачныя рэшткі, хворыя караняплоды.

Каб не страціць ураджай з-за гніляў, праграваўйце насенне перад пасевам. На захоўванне закладвайце толькі здаровыя караняплоды, апудрыўшы іх мелам ці прасеяным попелам (150-200 г парашку на 10 кг морквы). Захоўвайце севазварот. Кіслыя глебы вапнуйце. Своечасова ўбірайце ўраджай (да замаразкаў). Пасля ўборкі адразу абразайце лісце, пакідаючы хвосцікі ў 1 см. Захоўвайце моркву ў скрынях ці адкрытых поліэтыленавых мяшках, перасыпаўшы трохі вільготным пяском. У другой палове сезона падкормлівайце калійнымі ўгнаеннямі ці настоем попелу.

**Фамоз (сухая гніль)**. Гэта таксама грыбковае захворванне, пашкоджвае ўсе часткі морквы. У канцы сезона на лісці, хвосціках з'яўляюцца светла-бурыя плямы з чорнымі кропкамі ў цэнтры. Пашкоджанне караняплода пачынаецца з галоўкі, на якой утвараюцца ўціснутыя цёмна-карычневыя плямы, потым яны распаўсюджваюцца па ўсёй паверхні. Мякаць становіцца трухлявай. Пад плямамі ўзнікаюць пустэчы. Носьбіты хваробы — раслінныя рэшткі, насенне і хворыя караняплоды.

Не закладвайце на захоўванне караняплоды з механічнымі пашкоджаннямі, падвялыя ці падмарожаныя. Каб павялічыць супрацiўляльнасць хваробам, за 10-12 дзён да ўборкі падкарміце моркву сернакіслым каліем ці растворам попелу. Пры закладцы на захоўванне апудрыце вапнай ці попелам. Праглядайце запасы, выдаляючы хворыя караняплоды.

Морква любіць лёгкія глебы з нейтральным pH, але можа расці і на цяжкіх глебах, калі яны добра акультураны і маюць рыхлы слой глыбінёй не менш за 20 см. Ушчыльненыя глебы лепш за ўсё пераносіць морква тыпу Шантанэ з кароткім і тупым на кончыку коранем.

Градкі з морквай лепш размяшчаць на добра асветленых месцах, бо недахоп святла моцна адбіваецца на ўраджаі.

Лішак вільгаці ў глебе выклікае захворванне каранёў морквы, таму на месцах, дзе блізка знаходзяцца грунтавыя воды, градкі робяць вышынёй не меней за 30-35 см.

Морква, якая вырасла на арганіцы, значна смачнейшая за тую, якая вырасла з ужываннем хімікатаў. Пра гэта кажуць усе, хто паспрабаваў абодва метады.

Морква непатрабавальная да пажыўнасці глебы. Яна не любіць высокіх доз угнаенняў, і асабліва азоту. Морква, што вырасла на глебе, багатай лёгкадаступным азотам, вызначаецца дрэнным смакам, а караняплоды яе становяцца «валасістымі» і раздвоенымі.

На градкі, прызначаныя для морквы, увесну ўносяць невялікую дозу, але толькі саспелага кампосту, у сярэднім 1—3 кг на 10 кв.м. Свежы гной і няспелы кампост надаюць яе караням непрыемны смак і выродлівую форму.

Моркву рэкамендуецца вырошчваць пасля капусты, якая вельмі патрабавальная да сілкавання, атрымлівае высокую дозу кампосту і забірае з яго вялікую частку азоту, пакідаючы шмат фосфару і калію. Гэта як раз тое, што трэба для морквы.

Недапушчальныя папярэднікі: пастарнак, пятрушка, фенхель, сельдэрэй, кабачок.

Морква — холадаўстойлівая культура, таму можна сеяць яе вельмі рана. Аднак наўрад ці варта гэта рабіць. Насенне морквы прарастае вельмі павольна, і тым павольней, чым ніжэй тэмпература. Пры 18 °С усходы з'яўляюцца праз 13—17 сутак пасля пасеву, пры 22—25 °С — праз 8—11 сутак.

Моркву сеюць і пад зіму, у лістападзе-снежні, па мерзлай глебе, сухім насеннем, каб яно да вясны не магло прарасці, інакш усходы вымерзнуць. Морква падзімовага пасеву дае больш ранні ўраджай. Яна ўжываецца галоўным чынам у летні перыяд, на захоўванне непрыдатная.

Усходжасць залежыць таксама ад якасці насення. Для захоўвання насення морквы вызначаны тэрмін 3-5 гадоў, аднак з часам усходжасць змяншаецца. Ужываюць просты спосаб вызначэння якасці насення — расціранне пальцамі. Пах свежай морквы сведчыць пра тое, што насенне добрай якасці.

Даты | Падзеі | Людзі

***Сусветны дзень жывёл. Адзначаецца па рашэнні Міжнароднага кангрэса прыхільнікаў руху ў абарону прыроды, які праходзіў у 1931 г. у Фларэнцыі.***

**1741** год — нарадзіўся Францішак Карпінскі, паэт, адзін з заснавальнікаў польскага сентыменталізму, асветнік. Жыў у Вене, Варшаве. З 1793 года ў Беларусі. Аўтар ідылій, лірычных вершаў, замалёвак і перакладаў. У аўтабіяграфічных «Дзённіках» апісаў жыццё ў Беларусі. Матывы беларускага фальклору выкарыстаў у творах «Падарожжа па зачараванай вуліцы», «Свецкія песні». Памёр у 1825 годзе.

**1895** год — нарадзіўся Рыхард Зорге, вядомы савецкі разведчык, Герой Савецкага Саюза (1964, пасмяротна). З 1914 года — у нямецкай арміі, удзельнік Першай сусветнай вайны. З 1924-га жыве ў СССР, з 1929-га — у разведорганах Чырвонай Арміі. У 1930-40 гадах у якасці нямецкага журналіста працуе ў Германіі, Кітаі, Японіі. У Токіа стварыў разведгрупу «Рамзан», якая здабывала важную для СССР інфармацыю. Адзін з першых паведаміў дату (20-22 чэрвеня) нападу фашысцкай Германіі на СССР, колькасць нямецкіх дывізій і агульную схему іх плана ваенных дзеянняў, а ў кастрычніку 1941-га — пра непадрыхтаванасць Японіі да нападу на СССР. У кастрычніку 1941 года арыштаваны японскай паліцыяй, праз два гады асуджаны да смерці на раяльнай струне. Берлін быў шакіраваны арыштам, Гітлер асабіста патрабаваў ад японскіх уладаў выдачы здрадніка, але беспаспяхова. Пры гэтым японцы прапаноўвалі Сталіну абмяняць Зорге, на што Сталін не пайшоў. На думку некаторых даследчыкаў, гэта адбылося з-за таго, што Зорге катавалі, і той прызнаўся, што быў агентам СССР, чаго Сталін не даравaў. У 1944 годзе Зорге быў павешаны, пахаваны ў Токіа.



**1971** год — амерыканскі інжынер Рэй Томлісан накіраваў адначасова ўсім сваім знаёмым першы ў свеце e-mail: гэта быў тэкст выступлення прэзідэнта А. Лінкальна ў Гётысбергу. Сёння Томлісана называюць «бацькам сучаснай электроннай пошты».

Было сказана

**Пятрусь Броўка (1905—1980), народны паэт Беларусі:**

*«Дарог у свеце вельмі многа, а ты між іх сваю знайдзі. Няхай нялёгкая дарога — а ты ідзі, а ты ідзі!».*

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Па гарызанталі:** Гарбата. Палуба. Амур. Спа. Рыс. Кума. Рында. Пандус. Конка. Рад. Стрыж. Лухта. Туз. Сук. Кат. Апіс. Сірока. Малахіт. Кон. Панда. Дока. Сліва. Радар. Прас. Тропік. Дуда. Хмара. Карбункул.

**Па вертыкалі:** Перапёлка. Ікс. Кнехт. Арол. Поні. Куратнік. Вектар. Уса. Сапа. Трап. Доза. Плод. Марак. Шнур. Лук. Агіда. Парасон. Марс. Кар. Расток. Асада. Нераст. Ход. Піка. Кірха. Жако. Тарантул.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 7.17 | 18.38 | 11.21 |
| Віцебск | — 7.08 | 18.26 | 11.18 |
| Магілёў | — 7.07 | 18.28 | 11.21 |
| Гомель | — 7.03 | 18.26 | 11.23 |
| Гродна | — 7.33 | 18.53 | 11.20 |
| Брэст | — 7.32 | 18.55 | 11.23 |

**Месяц**

*Поўня 30 верасня. Месяц у сузор'і Блізнят.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Валянціна, Васіля, Данілы, Івана, Іосіфа, Уладзіміра.*

***К.*** *Разаліі, Ружы, Конрада, Францішка.*



Фота Дар'і ЗВЕРС.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**Жанчына ўважліва слухае мужчыну, толькі калі ён размаўляе па тэлефоне з іншай жанчынай.**

— Сяржант Пятрэнка. Малады чалавек, вы нецвярозы!

— Чаму гэта я нецвярозы — вось аптэчка, вось тэхпашпарт, вось рэмень бяспекі.

— Вы будзеце спрачацца з сяржантам ДАІ?! Вы нецвярозы!

— Давайце разбірацца. Аптэчка ёсць? Тэхпашпарт ёсць? Рэмень ёсць? Нават ручнік вось ёсць. Дык чаму я — нецвярозы?!

— Машына дзе?!




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.149. Індэкс 63850. Зак. № 4445.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 кастрычніка 2012 года.